Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт

Т.І. Доўнар

# Канстытуцыйнае права Беларусі феадальнага перыяду
(па Статутах Вялікага княства Літоўскага 1529, 1566, 1588гг.)

Мінск, 2001

Рэцэнзенты:

А.Ф. Вішнеўскі, доктар гістарычных навук, прафесар Акадэміі МУС Рэспублікі Беларусь;

Н.А.Слабодчыкаў, кандыдат юрыдычных навук, прафесар Інстытута сучасных ведаў

Рэкамендавана:

Кафедрай тэорыі і гісторыі дзяржавы і права юрыдычнага факультэта БДУ (пратакол № 3 ад 28.11.2000г.);

Вучоным Саветам юрыдычнага факультэта БДУ (пратакол № 3 ад 5.12.2000г.)

**Доўнар Т.І. Канстытуцыйнае права Беларусі феадальнага перыяду ( па статутах Вялікага княства Літоўскага 1529, 1566, 1588гг.). Вучэбны дапаможнік.- Мн.: Белдзяржуніверсітэт, 2001.- 76 с.**

Прысвечана даследаванню гісторыі канстытуцыйнага права Беларусі. На падставе аналізу нарматыўнага матэрыялу (нормаў Статутаў 1529, 1566, 1588 гг.) а таксама навукова-літаратурнага матэрыялу праследжваецца развіццё нормаў і інстытутаў канстытуцыйнага права Беларусі XVI ст.

Прызначана выкладчыкам і студэнтам вышэйшых навучальных установ і ўсім тым, хто цікавіцца гісторыяй Бацькаўшчыны.

# УВОДЗІНЫ

У прэамбуле дзеючай Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь гаворыцца аб шматвяковай гісторыі развіцця беларускай дзяржаўнасці, якая ўзнікла ў далекай старажытнасці і развівалася ў рэчышчы агульнаеўрапейскай гісторыі.

Феадальная Беларусь- гэта велізарны гістарычны пласт, якому характэрны цікавыя з'явы і працэсы. У XV-XVI стагоддзях завяршаецца працэс фарміравання беларускай народнасці, у сферы дзяржауна-палітычнай складваецца саслоўна-прадстаўнічая манархія з яе характэрнымі рысамі і палітычнымі атрыбутамі, адбываюцца значныя сацыяльна-эканамічныя пераўтварэнні, якія завяршаюцца цэлай серыяй рэформаў, у тым ліку і прававой. Вынікам адзначаных працэсаў з'явілася высокаразвітая прававая сістэма.

У гісторыі права найбольш акрэслена адлюстроўваюцца характэрныя рысы сацыяльна-эканамічнага і палітычнага жыцця народа і тыя змены, якія адбываліся ў сувязі з развіццем і ўскладненнем гістарычнага працэсу. Як элемент агульнай культуры грамадства, права таксама адлюстроўвае узровень духоўнага жыцця народа, светапогляд грамадства ў той ці іншы перыяд часу, змены ў правасвядомасці народа. Вывучэнне прававой гісторыі дае нам уяўленне не толькі аб стане і характэрных рысах развіцця дзяржавы, але і аб месцы асобы ў ёй.

Вывучэнне прававой спадчыны беларускага народа даволі доўга стрымлівалася шэрагам фактараў. У невялікай колькасці навуковых публікацый толькі закраналася гэтая праблема, часцей за ўсе ў выглядзе кароткай характарыстыкі асноўных палажэнняў інстытутаў права. Непасрэдна праблеме канстытуцыйнага права прысвечаны вядомыя толькі вузкаму колу спецыялістаў працы дарэвалюцыйных вучоных, аднак у гэтых даследаваннях аналізаваліся толькі асобныя прававыя нормы і інстытуты.

У дадзеным вучэбным дапаможніку зроблена спроба на падставе аналізу навукова-літаратурнага і, самае галоўнае - заканадаўчага матэрыялу, ахарактарызаваць працэс складвання і развіцця асноўных нормаў і інстытутаў канстытуцыйнага права феадальнай Беларусі XVI стагоддзя. У гісторыка-прававой літаратуры мае месца вычляненне ў феадальным праве агульнапрынятых формаў і ўжыванне сучаснай юрыдычнай тэрміналогіі, хаця ў той час галіновая структура права толькі зараджалася, а тэрміналагічны апарат знаходзіўся на стадыі распрацоўкі. Менавіта таму ў феадальным законе мы бачым часам вельмі грувасткія канструкцыі канстытуцыйных артыкулаў, шматслоўе, паўтарэнне адных і тых жа палажэнняў і інш. У цэлым жа заканадаўца XVI стагоддзя дастаткова добра ўсведамляў асноўныя юрыдычныя паняцці і ў пэўнай ступені карыстаўся усталяваўшымся юрыдычным апаратам.

Развіцце канстытуцыйнага феадальнага права Беларусі праходзіла пад уздзеяннем унутраных і знешніх сацыяльна-эканамічных і палітычных працэсаў. Звычаёвае права, якое існавала ў старажытнасці на асобных землях

Беларусі, было пазбаўлена адзінства, імела асаблівасці ў рэгуляванні праваадносін. Паступова, на працягу XIV-XVI стагоддзяў, паралельна с працэсам кансалідацыі асобных земляў-княстваў у складзе Вялікага княства Літоўскага, праходзіў працэс уніфікацыі права з актыўнай распрацоўкай новых прававых нормаў, якія адпавядалі больш складаным умовам сацыяльна-эканамічнага развіцця дзяржавы. У гэты перыяд зараджаюцца асновы беларускага канстытуцыяналізму.

Дадзены дапаможнік знаёміць з працэсам складвання агульназемскага канстытуцыйнага права і дае магчымасць уявіць узровень і тэндэнцыі развіцця прававой культуры беларускага народа.

# КАНСТЫТУЦЫЙНЫЯ НОРМЫ Ў ПЕРШЫМ ЗВОДЗЕ ЗАКОНАЎ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА – СТАТУЦЕ 1529 ГОДА

Назапашаныя ў XIV-XVI стагоддзях у Вялікім княстве Літоўскім заканадаўчыя акты запатрабавалі прывядзення іх у пэўную сістэму, таму ў пачатку XVI ст. ствараецца спецыяльная камісія для кадыфікацыі заканадаўства. Члены гэтай камісіі дакладна невядомы, аднак адным з членаў яе, як адзначае І.А. Юхо, быў Францыск Скарына. Ідэі гэтага выдатнага беларускага мысліцеля і асветніка знайшлі адлюстраванне у Статуце 1529 года, які быў уведзены ў дзеянне 29.09.1529 года. Ён складаўся з 13 раздзелаў і 244 артыкулаў. Пазней у выніку паступовага ўключэння ў яго новых артыкулаў іх агульная колькасць павялічылася да 283.

Першы звод законаў дзяржавы быў выкліканы да жыцця шматлікімі прычынамі. Новыя сацыяльна-эканамічныя і палітычныя працэсы ў Княстве патрабавалі іх заканадаўчага рэгламентавання. Саслоўе шляхты, станаўленне якога яскрава праследжваецца ў папярэдніх заканадаўчых актах, патрабуе павелічэння і заканадаўчага замацавання сваіх правоў. У гэты перяд завяршаецца працэс кансалідацыі тэрыторыі дзяржавы, цэнтральная ўлада набывае ўсе большую моц. Усе гэта і знайшло заканадаўчае увасабленне у першым зводзе законаў дзяржавы.

Крыніцамі Статута 1529 года былі ўсе папярэднія заканадаўчыя акты Вялікага княства Літоўскага, звычаёвае права, судова-адміністрацыйная практыка дзяржавы, у пэўнай ступені рымскае і царкоўнае права. Аднак перш за ўсё вучоныя адзначаюць, што галоўнай крыніцай Статута было звычаёвае права, г.зн.права старажытных беларускіх дзяржаў-княстваў.

Статут унёс шмат новага ў развіццё сусветнай прававой думкі. Самае галоўнае, што яго адрознівала ад падобных заканадаўчых актаў іншых дзяржаў, гэта яго канстытуцыйная накіраванасць і ўласныя падставы кадыфікацыі (ён не паўтараў класічную рымскую сістэму права, а грунтаваўся на ўласнай сістэме, шмат у чым падобнай на сучасную). Першыя тры раздзелы Статута ўключалі ў асноўным нормы канстытуцыйнага характара, хаця яны змяшчаліся і ў іншых раздзелах. 4 і 5 раздзелы ўтрымлівалі ў асноўным нормы спадчыннага і шлюбна-сямейнага права, 6 – судова-працэсуальнага, 7 - крымінальнага, 8 - зямельнага, 9 – адміністрацыйнага (ляснога і паляўнічага), 10 – грамадзянскага, 11-13 – крымінальнага і крымінальна-працэсуальнага права

Статут замацаваў асновы грамадска-палітычнага ладу дзяржавы, парадак утварэння, склад і паўнамоцтвы некаторых дзяржаўных і судовых органаў, прававое становішча розных катэгорый насельніцтва і іншае. У ім утрымліваліся шматлікія канстытуцыйныя нормы, аднымі з важнейшых сярод якія былі тыя, якія абмяжоўвалі ўладу вялікага князя. Усе справы ў дзяржаве ён павінен быў вырашаць “дзеля агульнай карысці” са згоды паноў радных. Вялікі князь( гаспадар дзяржавы) абавязваўся захоўваць тэрытарыяльную цэласнасць дзяржавы, на даваць пасад чужаземцам,

прытрымліваца законаў і звычаў дзяржавы, ахоўваць правапарадак. Па Статуту вялікі князь з'яўляўся вышэйшай службовай асобай дзяржавы, павінен быў падпарадкоўвацца дзяржаўным законам і пры рэалізацыі сваіх уладных паўнамоцтваў дзейнічаць толькі ў межах статутавых нормаў. Адзін з артыкулаў Статута прама гаворыць:"Вси подданые наши, так вбогие, якое и богатые, которого роду колве або стану были бы, ровно а одностайным писаным правом маюць сужоны быти" (р.1,арт.12)., г.зн.усталёўваецца прынцып адзінага права для ўсіх жыхароў дзяржавы. Увядзенне ў Статут гэтай нормы-прынцыпа было вельмі важным, бо садзейнічала фарміраванню суверэнітэта нацыі. Дзяржава забяспечвала свой суверэнітэт шляхам пашырэння юрысдыкцыі на ўсю сваю тэрыторыю, а аднолькавае дзеянне закона ў адносінах да ўсіх падданых садзейнічала рэлігійнай згодзе і ўтварэнню адзінай нацыі.

У Статуце не мае яшчэ свайго юрыдычнага замацавання падзел уладаў у выглядзе нормы-прынцыпа, адна гэта ўжо існуе як ідэя, якая пранізвае ўвесь заканадаўчы акт. Аб гэтым сведчыць шэраг нормаў. Так, вялікі князь абавязваецца прымаць законы сумесна з панамі-радай, а ў некаторых выпадках патрабуецца "ухвала земская" – скліканне сойма (напрыклад, пры вызначэнні колькасці прадстаўлення ратнікаў). У Статуце ўдакладняецца норма аб недатыкальнасці асобы. Вядома, перш за ўсё мелася на ўвазе шляхта, правы якой дастаткова поўна рэгламентаваліся гэтым законам (р.3 і інш.). Статут таксама ўдакладняе і развівае палажэнні, якія раней былі выкладзены ў агульназемскіх граматах: аб ахове тэрыторыі дзяржавы, вайсковай службе і шмат іншае. Так, напрыклад, у Статуце не проста рэгламентуецца, як у грамаце Ягайлы 1387 года, старажытная "пагоня", а гаворыцца ўжо аб добра арганізаванай ваеннай службе з канкрэтызацыяй правоў і абавязкаў ваеннаабавязанага насельніцтва, у тым ліку пералікам ваеннаабавязаных, перыядычнымі аглядамі войска і г.д. (р.2). Пры перапісу войска нават вызначалася масць каня (р.2, арт.3). Нормы гэтага раздзела наглядна паказваюць развіццё ідэі, адлюстраванай у граматах ХУ стагоддзя, аб суверэнітэце дзяржавы.

Шмат увагі надаваў Статут 1529 года судовай уладзе, якая не была яшчэ выразна аддзелена ад адміністрацыйнай, аднак суддзі абавязваюцца адпаведнымі нормамі судзіць сумленна, справядліва і правільна, у адпаведнасці з законам (р.6, арт.1). Гарантыямі справядлівасці судовых рашэнняў з'яўляецца права на абскарджанне судовых пастаноў, наяўнасць інстытута адвакатуры, а таксама замацаванне такіх важных прынцыпаў (якія мелі месца ў агульназемскіх граматах), як адказнасць кожнага за сваю віну, у адпаведнасці з законам і ў судовым парадку (р.1,арт.7). Гэтыя палажэнні ўтрымліваюць ужо элементы прэзумпцыі невінаватасці.

Статут рэгламентуе нават тэрмін даўнасці крымінальнага праследавання: у адносінах цяжкіх злачынстваў -10 гадоў, менш цяжкіх – 3 гады (р.7,арт.27). Аб прагрэсіўным накірунку развіцця крымінальнага права сведчыць артыкул, які забараняе аддаваць у вечную няволю свабоднага чалавека за здзейсненнае ім злачынства. У выніку ўзнікнення юрыдычнага

канфлікту закон абавязвае прымяняць толькі статутавыя нормы. Адмова ў ажыццяўленні правасуддзя па прычыне адсутнасці ў Статуце адпаведнай прававой нормы  забараняецца. У гэтым выпадку дазвалялася прымяняць звычаёвае права. Законам ахоўваўся аўтарытэт суда.  Так, за праяўленне непавагі да суддзяў прадугледжавалася крымінальная адказнасць. Нормы Статута сведчаць аб дастатковай моцы і аўтарытэце судовай улады ў дзяржаве. Пры ажыццяўленні правасудддзя суддзі нікога не павінны былі ганьбаваць. Яны  таксама неслі адказнасць за  свае неправамерныя дзеянні.

Статут 1529 года шмат увагі надае нормам, якія забяспечвалі правы феадалаў (у тым ліку права ўласнасці на зямлю),  рэгламентуе маёмасныя праваадносіны, пытанні спадчыны і апекі, клапоціцца аб правах жанчын, у тым ліку і аб іх маёмасным забеспячэнні,  дэкларуе права жанчын свабодна выходзіць замуж і шмат іншае. Ён нават утрымлівае прыродаахоўчыя нормы. Значэнне Статута пераацаніць нельга, тым больш, што ён быў напісаны на беларускай мове і быў даступным народу. Шматлікія вучоныя і  палітычныя дзеячы адзначаюць, што такога закона ў той час яшчэ не мела феадальная Еўропа.  Статут меў галоўнай мэтай – умацаванне адзінства дзяржавы і яе суверэнітэту. Палажэнні Статута сведчаць аб багатай прававой культуры беларускага народа, якая развівалася ў рэчышчы агульнаеўрапейскай культуры.

# РАЗВІЦЦЁ КАНСТЫТУЦЫЙНЫХ НОРМАЎ У СТАТУЦЕ 1566 ГОДА

Прыняцце Статута 1529 года вызначыла мяжу паміж партыкулярным сярэдневечным правам і новым сістэматызаваным і ўніфікаваным заканадаўствам. Пасля ўвядзенне яго ў дзеянне суддзі ўжо спасылаюцца не на звычай, а выносяць судовыя рашэнні “водлуг обычая права и Статута земского”, “яко в статуте господарском описуеть”. У складаных выпадках, пры неурэгуляванасці законам грамадскіх адносін суддзі звярталіся “за навукай” да вялікага укнязя, або часам да вышэйшых службовых асоб дзяржавы. Першы Статут заклаў трывалыя падставы далейшага развіцця заканадаўства Вялікага княства Літоўскага. Аднак новыя сацыяльна-эканамічныя з’явы ў дзяржаве, актыўнае развіццё гарадоў, актывізацыя таварна-грашовых адносін і інш. запатрабавалі ўдасканалення права. Узнікае ініцыятыва “паправы” Статута 1529 года, у сувязі з чым ствараецца статутавая камісія. Пачынаючы з 1551 года, ”паправы” сістэматычна абмяркоўваюцца на соймах дзяржавы, што само па сабе сведчыць аб узроўні тагачаснай прававой культуры і новых тэндэнцыях у развіцці права Вялікага княства Літоўскага.

Асноўнымі крыніцамі новага зводу законаў сталі папярэднія заканадаўчыя акты (вядома, у першую чаргу Статут 1529 года), судова-адміністрацыйная практыка, а таксама рымскае права (класічнае і перапрацаванае) , кананічнае і царкоўнае права.

Статутавая камісія ўлічыла і перапрацавала ўвесь сярэдневечны прававы вопыт, як уласны (бо юрыдычная навука і высокі ўзровень падрыхтоўкі асноўных судовых кадраў уносілі ў судовую практыку элементы навукі права), так і сусветны. У склад камісіі уваходзілі “асобы певные, рады маршалкове, врядники земские, хоружие и иные особы роду и народу шляхецкого, доктори прав чужоземских». У камісіі працавалі, як мяркуюць даследчыкі прававой гісторыі, такія выдатныя правазнаўцы свайго часу, як Павел Астравіцкі, Марцін Валадковіч, Станіслаў Нажускі і іншыя. Асаблівую ролю ў распрацоўцы праекта Статута адыгралі “дактары правоў чужаземскіх”, знаўцы рымскага права Аўгусцін Ратондус і Петр Раізій, якія былі прыхільнікамі гуманістычнага накірунку развіцця права і садзейнічалі саступленню схаластычнага метаду трактавання права сістэматычнаму і сінтэтычнаму. Мела шмат прыхільнікаў на Беларусі і еўрапейская прававая культура эпохі Адраджэння, што знайшло адлюстраванне, напрыклад, у тэндэнцыі развіцця інстытута буржуазнай уласнасці.

Праект новага Статута быў пададзены на сойм толькі у 1561 годзе, аднак зноў доўгі час вяліся дэбаты і хаця меркавалася прыняць яго ў 1564 годзе, ён быў уведзены ў дзеянне толькі з 1.03.1566 года. У Статут былі ўключаны тры прывілеі: Віленскі 1563 года, Бельскі 1564 года і Віленскі 1566 года. У структурных адносінах, нягледзячы на пэўныя змены, ён прытрымліваўся папярэдняга Статута, аднак налічваў ужо 14 раздзелаў і 367 артыкулаў. Ён ўтрымліваў нормы ўсіх галін тагачаснага права:

канстытуцыйнага, грамадзянскага (у тым ліку абавязацельнага, залогавага, зямельнага, апякунскага, спадчыннага), шлюбна-сямейнага, адміністрацыйнага, крымінальнага, судова-працэсуальнага і інш. Як і папярэдні Статут, ён замацоўваў і паўтараў на больш высокім юрыдычным узроўні палажэнні аб адзінстве права на ўсей тэрыторыі дзяржавы і для ўсіх падданых (хоць па феадальнаму праву яно не магло быць і не было роўным для усіх катэгорый насельніцтва), дзяржаўным суверэнітэту (насуперак царкоўнаму касмапалітызму), прыярытэту пісанага права, абмежаванні ўлады вялікага князя і г.д. Самыя важные, новыя палажэнні Статута тычыліся канстытуцыйнага, грамадзянскага, судова-працэсуальнага і крымінальнага права. Як і ў Статуце 1529 года, канстытуцыйнаму праву былі прысвечаны першыя тры раздзелы новага звода законаў дзяржавы, хаця канстытуцыйныя нормы ўтрымліваліся і ў іншых раздзелах .

Ад імя вялікага князя Статут 1566 года забараніў карыстанне звычаёвым правам і патрабаваў з гэтага часу карыстацца толькі статутавымі нормамі. Ён не толькі больш дакладна і поўна рэгламентаваў дзейнасць такіх вышэйшых органаў дзяржавы, як вялікі князь і рада, але канчаткова замацаваў заканадаўчую функцыю сойма. Закон гаварыў аб складзе і кампетэнцыі сойма, аб парадку абрання павятовых дэпутатаў на сойм, аб дзейнасці павятовых соймікаў – органаў т.зв. шляхецкай дэмакратыі. Улада князя абмяжоўвалася не толькі радай, але і соймам, без згоды якога ён не меў права пачынаць вайну, уводзіць новыя падаткі, прымаць новыя законы (р.2, арт.2). Закон абавязваў вялікага князя ўсіх князёў, паноў радных, феадалаў, службоўцаў, шляхту, мяшчан і “всих людей посполитых… заховати при свободах и вольностях” (р.3, арт.2).

Упершыню ў статутавых нормах праяўляецца тэндэнцыя аддзялення судовай улады ад выканаўчай. Рэгламентавалася дзейнасць новых – падкаморскіх і земскіх судоў, апошнія з якіх з’яўляліся выбарнымі, аддзеленымі ад адміністрацыі. Суддзі, да якіх прад’яўляўся шэраг патрабаванняў і якія прыносілі пры ўступленні на пасаду прысягу аб сумленным выкананні сваіх службовых абавязкаў, выбіраліся на пасады пажыццёва. Гэтыя нормы Статута сведчаць аб зараджэнні новых, больш прагрэсіўных праваадносін у дзяржаве.

Аб зараджэнні буржуазных праваадносін сведчыць і першы артыкул сёмага раздзелу, які дазволіў усім феадалам свабодна распараджацца сваёй нерухомасцю (у адрозненне ад Статута 1529 года, які дазваляў распараджацца толькі 1/3 часткай нерухомай маёмасці). Тым самым акрэсліўся пераход ад феадальнага права ўласнасці да буржуазнага. У аналагічным накірунку развіваліся і спадчынныя праваадносіны, у якія былі унесены значныя змены. Толькі парадку наследавання маёмасці і афармленню завяшчальных запісаў (тэстаментаў) быў прысвечаны новы раздзел закона. Статут нават утрымліваў узоры некаторых юрыдычных дакументаў.

У прагрэсіўным накірунку развівалася Статутам і крымінальнае права: суб’ектам злачынства прызнаваўся толькі чалавек, упершыню вызначаўся

законам узрост крымінальнай адказнасці – з 14 гадоў, быў зроблены значны крок у замацаванні прынцыпа прэзумпцыі невінаватасці і шмат іншае.

Як і папярэднія законы, Статут 1566 года перш за ўсе клапаціўся аб шляхце, заканадаўча замацоўваў галоўную ролю буйных феадалаў у дзяржаве і іх прывілеі. Менавіта ў гэтым і праявілася супярэчлівасць Статута: з аднаго боку ён абвяшчаў самыя прагрэсіўныя ідэі і прынцыпы, звяртаючыся да ўсяго насельніцтва і удакладняючы: як да багатых, так і да бедных, як да людзей вышэйшага стану, так і да людзей ніжэйшага стану, а з другога боку – перш за ўсё клапаціўся аб феадалах і абараняў іх інтарэсы.

Асаблівасцю Статута 1566 года было тое, што ён працягваў дзейнічаць пад назвай “Валынскі Статут” на далучаных да Польшчы ў 1569 годзе Валынскім, Кіеўскім, Брацлаўскім ваяводствах (за выключэннем некаторых артыкулаў) і пасля ўвядзення ў дзеянне новага звода законаў дзяржавы - Статута 1588 года.

# СТАТУТ 1588 ГОДА - АСНОЎНАЯ КРЫНІЦА КАНСТЫТУЦЫЙНАГА ПРАВА БЕЛАРУСІ XVI-XVIII СТАГОДДЗЯЎ

Пасля прыняцця Статута 1566 года ў Вялікім княстве Літоўскім адбыліся значныя змены у палітычным і сацыяльна-эканамічным ладзе. У дзяржаве працягваліся рэформы (прававаая, адміністрацыйна-тэрытарыяльная, судовая, зямельная, ваенная і інш.), Вялікае княства Літоўскае і Польшча аб'ядналіся ў канфедэрацыю - Рэч Паспалітую. У сувязі з гэтым патрабавалася ўнесці змены ў заканадаўства. Зноў утвараецца статутавая камісія з паноў-рады, павятовай шляхты, духавенства (па пяць ад каталіцкага і праваслаўнага), службовых асоб і юрыстаў. Многія члены камісіі дакладна вядомы, у тым ліку знакамітыя юрысты (практыкі і навукоўцы таго часу). Праект Статута рыхтаваўся доўга, таму ў складзе камісіі адбываліся змены, Да таго ж існуе меркаванне, што з 1588 года галоўная роля ў падрыхтоўцы Статута перайшла да павятовых соймікаў. Работу камісіі ўзначальвалі высокакваліфікаваныя правазнаўцы - канцлер Вялікага княства Літоўскага А.Б.Валовіч і падканцлер Л.І.Сапега.

У 1584 годзе работа над Статутам была скончана, але паколькі новы закон ігнараваў Люблінскую унію 1569 года, Польшча не згаджалася зацвердзіць Статут на агульным сойме Рэчы Паспалітай. Каб захаваць вялікакняжацкі трон, Жыгімонт III зацвердзіў Статут прывілеем ад 28.01.1588 года.

Трэці Статут у параўнанні з двума першымі меў не толькі больш значны аб'ем (487 артыкулаў, 14 раздзелаў), але і больш дасканалую сістэму размяшчэння прававога матэрыялу. Кадыфікатары дзяржавы распрацавалі і ў гэтым Статуце удасканалілі ўласную сістэму права, якая адрознівалася ад традыцыйнай рымскай сістэмы права і грунтавалася на новых прынцыпах, уласцівых пераходнаму перыяду ад сярэдневякоўя да новага часу. Увесь Статут пранізвала ідэя прававой дзяржавы, адной з падстаў якой быў замацаваны ім прынцып падзелу ўладаў -заканадаўчая улада належыла сойму, выканаўчая - вялікаму князю і радзе, судовая - новым, створаным у выніку судовай рэформы, судовым органам.

Больш дакладна ў Статуце 1588 года былі выкладзены прынцыпы абмежавання ўлады гаспадара, адзінства права на ўсей тэрыторыі дзяржавы і адносна ўсіх свабодных людзей, прыярытэт пісанага права і шмат іншае. Менавіта ў замацаванні гэтых прынцыпаў знайшла адлюстраванне тэндэнцыя фарміравання новай, буржуазнай правасвядомасці. У Статуце мы знаходзім шмат нормаў, якія сведчаць аб тым, што заканадаўца імкнецца прытрымлівацца прынцыпу справядлівасці ва ўсіх прававадносінах. Закон імкнецца абараняць не толькі саслоўныя правы асобы, але і асабістыя правы і інтарэсы кожнага свабоднага чалавека.. Невыпадкова ў яго артыкулах вельмі часта ўтрымліваецца зварот: "як к багатым, так і к бедным".

Статут 1588 года пераўзыходзіў папярэднія законы шырыней прававой рэгламентацыі амаль усіх, маючых месца у феадальнай дзяржаве,

праваадносін. У ім знайшлі адлюстраванне нормы ўсіх галін феадальнага права: ад канстытуцыйнага, да працэсуальнага. Па сутнасці Статут з'яўляўся Канстытуцыяй дзяржавы. Першыя тры раздзелы яго ў асноўным былі прысвечаны нормам канстытуцыйнага права, утрымлівалі гэтыя нормы і іншыя раздзелы Статута. Закон замацаваў такія важныя канстытуцыйныя прынцыпы, як суверэнітэт дзяржавы і народа, роўнасць усіх свабодных людзей перад законам, права чалавека на ўласнасць, на ахову яго жыцця, гонару, маёмасці, на судовую абарону і іншае. Для шляхты абвяшчалася права свабоднага выязду за межы дзяржавы, права прадстаўніцтва ў органах дзяржаўнай улады і кіравання.

Заканадаўца, зыходзячы з самых прагрэсіўных ідэй свайго часу, замацаваў у Статуце палажэнне, якое мела месца у папярэдніх законах, аб тэрытарыяльнай цэласнасці дзяржавы і яе недатыкальнасці (р.3,арт.1), тым самым абвясціўшы суверэнітэт Вялікага княства Літоўскага насуперак Люблінскай уніі. Закон увогуле абавязваў гаспадара вярнуць усё тое (меліся на увазе землі), што было калісьці "разобрано" і "упрошено" іншымі дзяржавамі. Патрабаванне вяртання земляў, захопленых Польшчай у Вялікага княства Літоўскага, выступае ў 1, 4, 5 артыкулах трэцяга раздзелу Статута з такой жа выразнасцю і дакладанасцю, як і у папярэднім Статуце 1566 года, які быў прыняты да заключэння Люблінскай уніі. Адлюстроўваючы імкненне заканадаўцы да незалежнасці, у Статут 1588 года былі уключаны нормы, якія забаранялі вялікаму князю надзяляць землямі і пасадамі іншаземцаў.

Складальнікі Статута вырашылі шэраг прававых праблем у духу эпохі Адраджэння. Артыкулы Статута абавязвалі службовых асоб, у тым ліку і самога вялікага князя, дзейнічаць у адпаведнасці з законам, абараняць інтарэсы дзяржавы і народа. Менавіта ў ХУІ стагоддзі не толькі звяртаецца ўзмоцненная ўвага на адзінства і незалежнасць, але і пачынае акрэслівацца ўяўленне аб адзіным грамадзянстве, бо пад тэрмінам "Літва" разумелася уся дзяржава, палітыка-эканамічным цэнтрам якой была Беларусь, а пад назвай "літвін" – яе грамадзянін. Разуменне адзінага грамадзянства пачынае дамінаваць над рэлігійнымі плынямі ў дзяржаве. Статут дэклараваў, што правы даюцца асобам "…так латынскага закону, яко и греческого". Адзін з самых прагрэсіўных артыкулаў Статута замацаваў прынцып верацярпімасці, што ва ўмовах суіснавання ў дзяржаве самых розных рэлігійных вераванняў было неабходным. Вялікі князь прама абавязваўся "покой посполитый межы розорваными и розными людми в вере и набоженстве заховывать» (р.3,арт.3).

Шматлікія нормы Статута сведчаць аб яго гуманістычнай накіраванасці. Ён грунтаваўся на рэнесансным гуманізме, цесна звязаным з сярэдневяковымі гуманістычнымі прынцыпамі: усведамленнем свабоды як сутнаснай якасці чалавека і яго самога як вышэйшай каштоўнасці зямнога быцця ў адзінстве з касмічным, разуменне духоўных запатрабаванняў чалавека. Статут адмоўна ставіцца да паняцця "няволя" І таму забараняе

аддаваць у вечную  няволю свабодных людзей, замяняе назву “чэлядзь нявольная” на “чэлядзь дваровую” і інш.

Гуманістычная накіраванасць Статута асабліва праяўляецца ў тых артыкулах, якія рэгламентуюць становішча жанчыны. Закон дэкларуе права жанчын свабодна, па сваёй волі выходзіць замуж, валодаць маёмасцю, забараняе цяжарную жанчыну прысуджаць да смяротнага пакарання, абараняе жыццё жанчыны двайной галоўшчынай і нават умешваецца ў прывілею царквы на развод мужа і жонкі (р.5).

Гуманізм Статута прасочваецца і ў тых артыкулах, якія прадугледжваюць вызваленне ад пакарання непаўналетніх злачынцаў, псіхічна хворых людзей і тых, хто знаходзіўся ў стане неабходнай абароны. Узрост крымінальнай адказнасці павялічваецца з 14 да 16 гадоў. Шляхціц за забойства простага чалавека мог быць пакараны смерцю, тым самым Статут паклаў пачатак рэалізацыі пастулата аб роўным пакаранні за забойства чалавека.

Статут 1588 года дапаўняў і развіваў палажэнні папярэдніх Статутаў. Ён замацаваў права усіх людзей судзіцца статутавымі нормамі, рэгламентаваў адказнасць за правапарушэнні толькі ў судовым парадку, у адпаведнасці з законам (р.1,арт.2). Пры вызначэнні меры пакарання суддзі абавязваліся ўлічваць усе абставіны справы, судзіць справядліва, адпаведна статутавым нормам, а ў выпадку няўпэўненасці – схіляцца  да вызвалення падсуднага ад пакарання.  Ідэя прэзумпцыі невінаватасці знайшла у Статуце заканадаўчае замацаванне.

Статут быў адным з першых еўрапейскіх законаў, які  ўсталёўваў нормы, накіраваныя на ахову прыроды, падтрыманне і павелічэнне яе рэсурсаў. Ён замацаваў парадак карыстання зямельнымі ўгоддзямі, пушчамі, рэкамі, азёрамі, рэгламентаваў пытанні палявання, рыбнай лоўлі, бортніцтва і інш. Пад аховай закона знаходзілася флора і фауна. Так, за  разбурэнне лебядзінага гнязда спаганяўся штраф тры рублі, сакалінага – шэсць  рублеў, за учыненне пажару ў лясах вінаваты пакрываў за свой кошт усе страты (р.10).

Значэнне Статута ўзрастала ад таго, што ён  быў адразу ж надрукаваны на беларускай мове (чым ганарыліся заканадаўцы) ў Віленскай тыпаграфіі братоў Мамонічаў. Гэта рабіла яго даступным шырокаму колу насельніцтва. Многія даследчыкі адзначалі ўжо адносна першага Статута, што такога закону не мела яшчэ феадальная Еўропа. Статут зрабіў значны ўплыў  на раўзвіццё  права Расіі (служыў узорам пры падрыхтоўцы Саборнага улажэння 1649 года), Польшчы, Украіны, Латвіі, Эстоніі. Аб юрыдычнай значнасці яго сведчыць тое, што ён быў дзеючым законам  амаль да паловы XIX стагоддзя.  Статут быў  адменены пасля далучэння Беларусі  да Расіі (у Віцебскай і Магілёўскай губернях у 1832 годзе, у Мінскай, Гродзенскай і Віленскай - у 1840 годзе).

Палажэнні Статута  сведчаць, што ён быў дастаткова тыповым феадальным законам і  таму ўвабраў у сябе ўсе  характэрныя рысы і супярэчнасці тагачаснага грамадства. Перш за ўсё ён абараняў асобу феадала

і яго ўласнасць. Адначасова нормы гэтага закона адлюстравалі паступальную тэндэнцыю ў развіцці феадальнага грамадства. Аб гэтым сведчаць усе тыя прагрэсіўныя ідэі і прынцыпы, выпрацаваныя чалавецтвам на працягу свайго існавання, якія заканадаўча замацаваў Статут. Многія палажэнні яго, у тым ліку і тыя, якія рэгламентавалі эканамічныя адносіны ў дзяржаве, шмат у чым апярэдзілі свой час. Статут 1588 года паслужыў узорам кадыфікацыі заканадаўства ў іншых краінах.

## 4. СТАТУТ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА 1529 ГОДА (вытрымкі з выдання: Статут Вялікага княства Літоўскага 1529 года. Мн., 1960)

ПРАВА ПИСАНЫЕ ДАНЫ ПАНСТВУ ВЕЛИКОМУ КНЯЗЬСТВУ ЛИТОВСКОМУ, РУСКОМУ, ЖОМОЙТСКОМУ И ИНЫХ ЧЕРЕЗ НАЯСНЕЙШОГО ПАНА ЖИКГИМОНТА, З БОЖЕЕ МИЛОСТИ КОРОЛЯ ПОЛСКОГО, ВЕЛИКОГО КНЯЗЯ ЛИТОВСКОГО, РУСКОГО, ПРУСКОГО, ЖОМОЙТСКОГО, МАЗОВЕЦКОГО И ИНЫХ

Мы, Жикгимонт, з ласки божи король польский и великий князь литовский, руский, пруский, жомойтский, мазовецкий и иных, маючи собе достаточное розмышлене умыслом добрым и з ласки нашое господарское хотячи обдаровати правы хрестьянскими, всим прелатом, княжатом, паном хоруговным, велможам, рыцерем повышоным, шляхте и всему посполству и их подданым а тубылцом земль Великого князьства нашего Литовского, которого бы колвек стадла *а* стану были, вей их права и привиля костелные, так латынского закону, яко и греческого, тэж и светцкие, которые от памяти королей и великих князей и от неколи отца нашего Казимера и брата нашего Александра, предков наших, за живота их, на которые бы колве добра и водности мети мають под которою-колве датою латынскою або рускою даны волности и в собе замыкаючи справедливо слушные, справные вышли, даны, взычоны, которые хочем так мети моцне, якобы в тые листы наши слово от слова были выписаны, которые словом нашим господарским и под присягою нашою телесною на светую евангелию вделаны держати и ховати слюбили есмо, как же обецуем и слюбуем во всих их положенях, обычаех и артыкулех з ласки, с цноты и щедрости нашое умыслили есмо потвердити и вмоцнити, как же потвержаем и вмоцняем сказуючи их мети моц вечными часы.

### 7. Не маеть никто ни за кого терпети, але кождый сам за себе

Тэж ни о чий-колве вчинок жадный иный не маеть каран быти и сказывайн, толко тот, который винен. А веджо завжды врад хрестьянского права заховываючи, судом не поконавши, не маеть быти каран, то ест ани жона за выступ мужа своего, ани отец за выступ сына, ани сын за отца, также и ни жадный прирожоный, ани слуга за пана.

### 9. Всих у Великом князьстве Литовском одным правом сужоно быти маеть

Тэж хочем и вставляем, и вечными часы маеть быти ховано, иж вси подданые наши, так вбогие, яко и богатые, которого раду колве

або стану были бы, ровно а одностайным тым писаным правом мають сужоны быти.

**14. Которые ся вспоминали за короля Казимира и за Олександра, тым обецуеть господар справедливость чинити**

Тэж которыи-колве за живота отца нашего на права свои справедливость жадали а за Олександра короля впоминали и листы впоминалные отца и брата нашого вказали, тым хочем и будем повинни с порадою рад наших всякую справедливость чинити без отволоки. От права тэж ничого брати не маем, также тэж и рады наши. А не маем стати и зычности, при одной стороне, але прото каждому справедливость давати и чинити будем повинни.

**19. Хто бы за Казимера короля которое имене во-в покои мел, а за Олександра нихто ся о то не впоминал**

Тэж хто бы которое имене або отчизну за короля Казимера во-в покои мел, а за Олександра нихто ся о то не впоминал, тогды маеть во-в покои держати. А хто будеть искати земли, а ему король дасть, не маеть иного ничего, толко так, как ему дано а как на короля держано…

**20. Хто бы кому на честь приганил, четвертого року маеть справедливость вчинена будеть**

Тэж коли бы хто на честь кому приганил або о добрую славу, а то бы ся ку нашои ясности приточило, всим справедливость чинити будем повинни…

А естли бы вмер, не дождавши четвертого року в оной справе, тогды ему ани потомком его у чсти шкодити не маеть. А приганеный не мает ся службы нашое вымовляти. А естли бы вбит был а того ся не справил, однакож ему и потомком его шкодити не мает.

**22. О вызволене от платов и от подвод, и от робот людей, новых, кроме стародавных, звычайных обычаев**

Хочем, абы вси посполитые люди, подданые княжат и панов хоруговных, шляхты, бояр и мещан тых земль Великого князьства Литовского, от каждое дани плаченя и податку, серебщизного званого, и тэж дякол и ото всих беремен повозовых, которые подводами зовуть, от воженя каменя, дерева або дров ку паленю плиты и вапна на городы наши, от кошеня сена и от инших несправедливых робот выняты были бы и до конца вызволены. И хочем при целости зоставити здавна звычайные обычаи подымованя стацей на станех, з стародавна звычайных, мосты старые поправляти и новые на старых местех будовати, замки старые поправляти и там же на тых старых местех делницы свои знову будовати, мостов новых будованя и старых дорог напрованя и под гонцы наши подвод даваня, где з стародавна даиваны суть.

### 23. Хто бы напротивку выроку господарскиму мовил

Естли бы што господар с паны радами нашол и сказане свое господарское вчинил, а хто бы хотел напротивку тому выроку господарскому быти, тогды таковый, будеть какого-колве стадла, так вышшего яко и нижнего, маеть у везеню седети шесть недел, а, до скарбу господарского предся маеть дати дванадцать рублев грошей.

### 24. Хто бы под ким што упросил, а ему наперед дано и в привили господарском наперед описано, таковый за привили первыми зостати маеть

Тэж естли бы хто што собе под ким упросил и в привили бы то собе выписал, а в того бы, под ким он то себе впросил, первей было в привили его выписано и то ему потвержоно, и того колко лет поживал и в держани был, тогды таковый першший привилей або лист умоцнен, и маеть держати и поживати подлуг першое даты и потверженя того привиля. А тот последний лист або привилей ни во што маеть обернен. Естли бы тэж хто собе которую реч выпросил и в листе то собе описал або потвердил, а того в держани не был до десяти лет, тогды таковый потом вжок тому прийти не можеть и лист его тэж ни во што маеть обернен быти.

### 25. Будучи в коруне Польской, не маеть господар никому ничего давати и привилев потвержати

Тэж уставуем, иж от того часу мы сами и потомки наши, будучи в панстве нашом коруне Полской, не маем никому ничего в панстве нашом Великом князьстве Литовском имeней, людей и земль давати и первых данин, кому будем дали, потвержати. Нижли мы сами и потомки наши, будучи у Великом князьстве, подданым нашим маем давати и их обдаровати подле их заслуг. А привилев на вечную реч не маем инде никому давати, олиж, кгды будем весполок с паны радами нашими на валном сойме. А так, естли бы хто после тое уставы нашое як-колве в нас люди и земли, кгды будем в Полщи, впросил албо первую данину нашу привилем нашим потвердил, таковые листы и привили наши в ничого оборочаем и не маем мы сами и потомки наши их держати…

### 26. Ездячи дорогою по двором господарским не маеть нихто становитися

Тэж уставуем, иж жаден с подданых наших по двором нашим, у панстве нашом Великом князьстве Литовском ездячи дорогами, не мають становитися и стацей жадных на себе и на кони свои не мають з дворов наших брати и сажовок наших волочити. И тэж которые дворы наши суть по пущам, в тых могут ся становити; нижли жадное шкоды и пожоги не мають в тых дворех наших нам учинити…

## *РОЗДЕЛ ВТОРЫЙ: О ОБОРОНЕ ЗЕМСКОЙ*

### [1]. Повинен кождый войну служити

Уставляем с призволенем рад наших зуполных и всих подданых, иж кождый князь и пан, и дворанин, и вдова, также иж который сирота, лета зуполные маючи або не маючи, и всякий иный человек, лета зуполные маючи и земское имене маючи, часу потребы с нами и с потомки нашими або при гетманех наших повинен войну служити и выправляти на службу военную, колко бы колинадобе было подле уфалы земское, яко на тот час потреба будеть вказывати, то ест з людей как отчизных, так похожих, и з ыменя так отчизного, как выслужоного, так купленого…

А хто бы колве с тых подданых, вышей мененых, войны не служил або, приехавши на рок, не пописался, а хотя и пописался, а шиху не дождал або шиховался, без воли гетмановые поехал проч, тот имене свое тратить под тым обычаем, якобы войны не служил; а то будеть в господарской ласце.

### [2] 1. Иж вси повинни становитися под хороговю своею поветовою и шиховатися

Хочем и тэж приказуем грозно, абы вей подданые наши военную службу повинни не инде бы ся шиховати ани ся инде становили персунами своими, толко под хороговю своею поветовою, в котором повете суть осели, кром особного росказаня гетманского…

### [15] 14. А кому бы стацыи на войне на самого и на кони его не достало

Кому бы не достало, будучи на войне, стацеи и самому естли або на кони его, тогды мает тот з вижом гетманским где ехати або пойти и взяти с потребу живности собе и на кони; а то мает заплатити подлуг уставы положоное. А дрова мають брати, где будуть стояти; нижли домов розбирати и плотов жечи, и ставов волочити ани спускати , ани жит и ярин топтати и травити не мають. А естли бы хто таковую шкоду вчинил, тогды мает гетман наш таковых в ланцуг сажати, а предся оный тую шкоду масть отправовати и гквалт платити…

## *РОЗДЕЛ ТРЕТИЙ: О СЛОБОДАХ ШЛЯХТЫ И О РОЗМНОЖЕНИ ВЕЛИКОГО КНЯЗЬСТВА*

### 1. Господар шлюбуеть панства его милости Великого князьства и панов рад ни в чом не понижати

Тэж, коли пан бог всхочеть взычнги допустити нам панства иного, также и кролевства, тогды панства нашего Великого князьства Литовского и рад наших ни в чом не вменшим, але от всякое легкости и пониженя, яко славное памяти отец наш чинил часу щастного панованя своего, того панства стеречи будем.

## 2. Господар шлюбуеть розмножати Великое князьство Литовское и, што не добре розобрано, ку панству привернути

Тэж добра князьства того Великого Литовского не вменшим, але што будеть несправедливо отдалено  и неслушне розобрано и упрохано, ку властности того князьства приведем я привести хочем.

## 3. Держаней и честей чужоземцом не мають даваны быти

Тэж шлюбуем и обецуем, иж в землях наших того Великого князьства земль и городов, и мест, и которых-колве дедицств, и держаня, и тэж которых-колве врадов наших або честей и достойности жадному обчому, але толко прирожоным а тубыл-цом тых земль наших Великого князьства и вышей мененого не  будемъ давати, и потомки наши не  будуть давати в держано и в поживане.

## 4. Врады старый мають захованы быти

Тэж уставуем: ач-колве право писаное дали есмо земли Великому князьству Литовскому, а ведже старых врадов воеводства Виленского и воеводства троцкого, и иных, воевод и каштелянов, и  канцлерства, и маршалства земского, и маршалства дворного, и старостове и врадницы наши ничим не вменшаем  мают ся кождый з них у своем повете справоватися: судити, радити и децких своих всылати и врадов своих вживати подле давного обычая : одно судити мають тым писаным правом.

## 5. Держанья на причины заочные не мають  отниманы быти

Тэж державцы дворов наших и тивунове на причины заочные через нас не мають быти никому отниманы.

А коли бы который  з урядников яко роспрошитель а шкодник  двора нашого  в нас  был обвинен, обоя сторона  мает перед нами очивисто стати: а выслухавши тую реч, винный подле заслуги маеть каран. Але без вины держаней отнимати не будем.

## 6.Господар шлюбуеть вси уфалы старые держати, а новые с паны радами прибавляти

Тэж о захование старых привелев земских и звычаев, которые в тых привилях описаны, потвержоны и вхвалены, або новых деланю, множеню, што бы ся мело причинити к нашому и речи посполитое пожитку , толко старым размышленем и тэж ведомостью а с порадою, и с призволенем рад наших Великого князьства Литовского радити и справляти будем.

## 7. Волности княжатом, панятом, шляхтам и мещаном господар его милость шлюбует в целости заховати

Шлюбуем своею парсуною господарскою, иж всю шляхту, княжата и паны хоруговные, и вси бояре посполитые, и мещане, и их людей заховати при слободах и волностях, от продков наших и тэж от нас даных им .

### 8. Волно всим з земли господарское для навченя вчинков рыцэрских до всяких земль, кром земль неприятельских, господар дозволяеть

Тэж узычаем, абы княжата и панове хоруговные, щляхта и бояре прречоные мели волную моц выйти с тых земль наших Великого князьства и иных для набытья лепшого щастья своего и навченя вчинков рыцэрских до всяких земль чужих , кром неприятелей наших .А веджо так, абы з добра их, так выходячих, службы наши не были омешканы, але нам и потомком нашим, яко при них ,были бы чинены, колко кроть надобе было водле уставы земское…

### 9. По смерти отцов дети, сынове и девки, отчизны отдалены не мають быти

Тэж по смерти отцов дети, сынове и девки добра отчизного и дедизного не мають быти отдалены, але тые добра и *зъ* их щадки властными зуполным правом посядуть, яко княжата и панове хоруговные, шляхта и мещане Великого князьства Литовского поседають и на пожитки свои оборочають.

### 10. Простых людей над шляхту господар не маеть повышати

Тэж не шляхту над шляхту не маем повышати, але всю шляхту заховати в их почтивости .

### 16. А хто бы не учстил листов воевод и старост, и державен, наших, чим таковый маеть каран быти

Тэж уставляем: естли бы хто листов воевод наших або старост, або державец наших не учстил або служебника збил, або лист покинул, таковый упадываеть у вину так, яко у кгвалту: у дванадцать рублев грошей, а оному служебнику навязка водле роду его, естли будеть то на него переведено правом.

## *РОЗДЕЛ ШОСТЫЙ: О СУДЬЯХ*

### [1]. Абы судили правом писаным; а естли бы судил иначей, маеть каран быти

Тэж уставуем, иж кождый воевода наш и староста, и маршалок земский, и маршалок дворный, и державцы наши кождый у своем повете не мають подданых наших иначей судити и справовати, леч тыми писаными правы которые всим подданым нашим Великого князьства дали …

…А естли бы хто с панов рад наших, воевод и старост, которые не суть в повете, также обвинен быти мел, тогды также маеть на першом сойме отказати або на року земском…

…А которых бы артыкулов небыло ещо в тых правах выписано, тогды тое право маеть сужено быти водлуг старого обычая, а на потом на валном сойме тот члонок иный, чего потреба вкажеть, маеть уписано быти.

**[2] 1. В суду не мает ся нихто отозвати до господара, але повинен будеть кождый один одному права достояти**

В суду нихто ся не маеть отозвати перед правом ни до нас, господара, ни до сойму, для того, абы в том волокиты не было, але повинен будеть кождый один другому достояти права аж до конца. А естли бы ся видело водле сказаня которой стороне кривда, а бачила бы сторона, иж ей не подле права писаного всказано, тогды маеть листа просити в суде сказаня своего, которым обычаем сказали на нем. А судьи повинни будуть ему дати лист под печатью своею, а он маеть з оными судьями перед нами або на первом сойме говорити и лист тых судей вказати. А естли бы судья выпису дати не хотел, тогды маеть взяти з собою трех шляхтичов и зася в него просити; тогды он конечно будеть повинен дати.

**[ 10] 9. О прокураторы**

О именя, о шкоды, о кгвалты не маеть жаден чужоземец прокуратором быти ани о том мовити перед нами, господаром, ани у земском праве, одно который бы был у Великом князьстве оселый.

***РОЗДЕЛ ДЕВЯТЫЙ:***
***О ЛОВЫ, О ПУЩИ, О БОРТНОЕ ДЕРЕВО, О ОЗЕРА, О БОБРОВЫЕ ГОНЫ, О ХМЕЛИЩА, О СОКОЛЬИ ГНЕЗДА***

**1. Хто бы чии ловы кгвалтом половил**

Тэж уставляем: хто бы чие ловы кгвалтом половил, тогды тому, в чией пущи будеть половил, маеть кгвалт заплатити дванадцат рублев грошей, а на нас, господара противен маеть заплат под ценою, который звер будеть половил, яко нижей написано…

## 5. КАМЕНТАРЫІ ДА СТАТУТА 1529 ГОДА

У прэамбуле да Статута вялікі князь літоўскі і кароль польскі Жыгімонт аб'яўляе аб тым, што жадае даць правы ўсім жыхарам дзяржавы - «подданым а тубылцом», свецкім і духоўным, праваслаўным і каталікам, усім тым, хто меў гэтыя правы ад папярэдніх князёў (Казіміра, Аляксандра і іншых). Гэта тычыцца маёмасных правоў і шляхецкіх вольнасцей, калі адносна іх былі выдадзены адпаведныя граматы на лацінскай ці рускай (у сэнсе тагачаснай беларускай) мовах. Князь адзначае, што правы гэтыя Статутам пацвярджаюцца і павялічваюцца на вечныя часы.

***Раздзел 1***

У першым раздзеле Статута паўтараюцца, удакладняюцца і дапаўняюцца палажэнні агульназемскіх грамат аб адказнасці кожнага

чалавека індывідуальна за уласныя правапарушэнні (**арт.1),** аб падпадрадкаванасці ўсіх людзей, як багатых так і бедных, аднолькавым пісаным законам дзяржавы (**арт.2),** аб абавязковым і неадкладным разглядзе, з удзелам паноў радных ,тых судовых спраў, якія былі ўзбуджаны пры папярэдніх князях (**арт.14)** і інш.

**Арт.19.** Пацвярджаюцца вялікім князем падараванні (пажалаванні) феадалам зямель, здзейсненныя папярэднімі князямі.

**Арт.20.** Князь абяцае ў заканадаўча рэгламентаваны тэрмін разглядаць судовыя справы, якія тычацца гонару і годнасці асобы. У тым выпадку, калі б хто не дачакаўся разгляду сваёй справы і памёр, гэта не павінна было шкодзіць яго нашчадкам.

**Арт.22.** Гаворыцца аб вызваленні жыхароў дзяржавы ад шэрагу павіннасцей і аб захаванні некаторых іх абавязкаў адпаведна звычаёваму праву.

**Арт.23.** Пад пагрозай крымінальнага пакарання павінны выконвацца пастановы вялікага князя, якія ён прымае сумесна з радай.

**Арт.24.** У тым выпадку, калі князем быў выдадзены пісьмовы дакумент (грамата) адносна маёмасных правоў адной асобе, а потым на гэту ж маёмасць ён выдаў іншай асобе грамату, то лічыцца законным першы дакумент. Акрамя выпадкаў не ўступлення ў валоданне маёмасцю на працягу дзесяці гадоў .

**Арт.25** мае вельмі важны характар у сувязі з тым, што Вялікае княства Літоўскае знаходілася ў стане уніі з Польшчай. Закон забараняе вялікаму князю, які адначасова з'яўляўся і каралём Польшчы, нікому нічога на тэрыторыі Княства не дараваць у той час, калі ён знаходзіўся ў Польшчы. Удакладняецца, што граматы на валоданне нерухомасцю ў дзяржаве павінны прымацца толькі разам з панамі раднымі (рада Вялікага княства Літоўскага) на вальным сойме.

Арт.26. Забараняецца падданым Вялікага княства станавіцца на пастой і браць з княжацкіх двароў пракорм для сябе і коней, акрамя двароў, якія былі размешчаны ў пушчах.

## ***Раздел 2***

У другім раздзеле, які прысвечаны воінскаму абавязку жыхароў Вялікага княства Літоўскага, важнымі з’яўляюцца палажэнні, якія рэгламентуюць абавязак усіх ваеннаабавязаных людзей пад час вайны выконваць воінскую службу паводле спецыяльнай пастановы, а таксама парадак з'яўлення ў дзеючую армію (**арт.1).**

**Арт.2.** Вялікі князь грозна прыказвае збірацца ўсім ваеннаабавязаным асобам пад павятовымі харугвамі (сцягамі), акрамя асаблівых гетманскіх прадпісанняў і інш.

**Арт.15.** Забараняецца на вайне рабіць шкоду мясцоваму насельніцтву, браць у яго розныя рэчы і харч. Пры неадкладнай жа патрэбе -

закон абавязвае кампенсаваць узятае ў насельніцтва адпаведна спецыяльнай уставы і інш.

## *Раздзел 3*

Раздзел прысвечаны правам і вольнасцям шляхты. Перш за ўсе вялікі князь абавязваецца ў выпадку набыцця права кіравання яшчэ якой-небудзь дзяржавай, не прыносіць шкоды Вялікаму княству Літоўскаму і панам радным (**арт.1**), не памяншаць тэрыторыю дзяржавы (**арт.2**), не даваць чужаземцам пасад і земляў у дзяржаве (**арт.3**), захоўваць папярэдне вызначаныя і дадзеныя пасады ў Княстве і дазваляць службовым асобам дзейнічаць адпаведна старым звычаям, аднак выкарыстоўваць пры гэтым Статут (**арт.4**).

**Арт.5.** Закон забараняе па завочнаму абвінавачванню адбіраць пасады і землі, а караць абвінавачаных патрабуе толькі за віну і ў судовым парадку .

**Арт.6-7.** Вялікі князь пацвярджае папярэднія заканадаўчыя акты, а новыя абяцае прымаць з мэтай карысці для дзяржавы і толькі з дазволу паноў рады, абяцае ўсіх феадалаў, мяшчан і іх людзей захоўваць пры свабодах і вольнасцях, дадзеных ім (гаспадаром) і яго папярэднікамі .

**Арт.8.** Замацоўвае права ўсіх феадалаў свабодна выязджаць за межы дзяржавы для пошуку лепшай долі, або навучанню рыцарскай справе, выключаючы землі непрыяцельскія.

У **арт.9** гаворыцца аб праве феадалаў і мяшчан свабодна наследаваць маёмасць уласных бацькоў.

**Арт.10.** Забараняецца ўзвышать простых людзей над шляхтай. Шляхту ж закон патрабуе заўсёды захоўваць пры свабодах і вольнасцях.

**Арт.16.** Пад пагрозай крымінальнага пакарання ўсе падданыя дзяржавы абавязваюцца выконваць пастановы мясцовай адміністрацыі.

## *Раздзел 6*

**Арт.1.** Замацоўваецца прынцып усеагульнасці права. Службовыя асобы дзяржавы і суддзі абавязваюцца ў сваёй дзейнасці карыстацца толькі пісаным законам. У выпадку неурэгуляванасці нормамі Статута тых ці іншых

грамадскіх адносін , дазваляецца дзейнічаць у адпаведнасці са звычаямі, аднак з умовай, што пазней на сойме новая норма павінна быць прынята.

**Арт.2.**Удакладняе папярэдні артыкул і патрабуе завяршэння разгляду справы ў судах нават у тым выпадку, калі б суддзі судзілі не ў адпаведнасці з пісаным законам . Аднак после разгляду справы пакрыўджаны разам з суддзямі павінен будзе з'явіцца на вялікакняжацкі або соймавы суд.

**Арт.10.** Заканадаўча замацоўваецца правіла адносна таго, што ў Вялікім княстве Літоўскім чужаземцы не маюць права быць адвакатамі («пракуратарамі»).

## ***Раздзел 9***

Упершыню ў гэтым раздзеле замацоўваюцца нормы, якія накіраваны на ахову прыроды. Так, **арт.1** пад пагрозай значнага штрафу на карысць вялікага князя і выплаты ўласніку кошта жывёлы забараняе паляваць у чужых лясах. Пры гэтым Статут дакладна рэгламентуе кошт лясных звяроў, птушак і інш.

# 6. СТАТУТ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА 1566 ГОДА

**(вытрымкі з выдання:Статут Великого князьства Литовского 1566 года и поправы статутовые 1578 года // Временник Московского о-ва истории и древностей российских. 1855., кн.25.С.1-242)**

## *РОЗДЗЕЛЪ ПЕРВЫЙ О ПЕРСОНЕ ГОСПОДАРСКОЙ*

**АРТЫКУЛЪ 25.**

***О МЫТЕХЪ НОВЫХЪ.***

Тежъ уставуемъ и приказуемъ, абы жаден человекъ въ томъ панстве нашомъ Великомъ Князстве Литовскомъ не смелъ новых мытъ вымышляти ани встановляти; ни на дорогахъ, ни на местехъ, ани на гребляхъ, ани на рекахъ, ани въ торгахъ, ани въ местечкахъ ни въ стодолохъ, або въ корчмахъ на гостинцахъ въ именьяхъ своихъ, кроме которые бы были зъ стародавна установлены, або мели бы на то листы продковъ нашихъ або наши…

...А на рекахъ портовыхъ, и на которыхъ портъ можетъ быти, а где кольвекъ въ панстве нашомъ Великомъ Князстве, жаденъ ставовъ новыхъ становити и гребли сыпати ку переказе порту и спусту не маеть мети. Такъ тежъ и езы на рекахъ портовыхъ, где зъ стародавна бывали, хтобы ставилъ; тогды предсе маеть местца заставляти такъ слушне, абы езомъ або тамованьемъ никому се шкода не стала. А таковыхъ речей воеводове, старостове, державцы наши кождый въ державе своей мають досмотрети, а новыхъ мытъ абы на реках портовыхъ и на ставехъ и на гребляхъ не было, также на езохъ абы проходы были слушные безъ завады заставованы.

**АРТЫКУЛЪ 26.**

***О НЕДАНЬЕ МЫТА ШЛЯХТЕ.***

Тежъ зъ ласки и доброти нашое господарское княземъ, паномъ радамъ духовнымъ и свецскимъ, шляхте въ томъ панстве нашомъ тую вольность на водахъ на дорогахъ, то есть сухимъ путемъ и воднымъ, на торгохъ, на мостехъ, такъ по именьяхъ нашихъ спущати и продавати зъ ихъ власныхъ гуменъ, кождому его роботы правдивое збожье а не купленое, отъ того мыто не маеть быти давано; такъ тежъ и одъ подводъ шляхецскихъ, которіе зъ ихъ речми властнымъ збожьемъ а стацыями, отъ того всего мыто и мостовое брано быти не маеть…

## РОЗДЕЛЪ ВТОРОЙ О ОБОРОНЕ ЗЕМСКОЙ.

**АРТЫКУЛЪ 1.**

***О ПОВИННОСТИ ЯКО ВСИ ОБЫВАТЕЛИ ВЕЛИКОГО КНЯЗСТВА ЛИТОВСКОГО ЧЫНИТЬ МАЮТЬ.***

Уставуемъ тежъ съ призволеньемъ радъ нашихъ зуполныхъ и всехъ становъ подданныхъ панства нашого Великаго Князства, ижъ кождый князь и панъ духовный и тежъ дворянинъ бояринъ и вдовы кождые и иные станы, и

татарове наши, такъ мешане местъ нашихъ, маючи земское именье и лета зупалные маючы, часу потребы зъ нами и потомками нашими або при гетманохъ нашихъ винни будуть сами особами своими войну служыти и выправовати на службу военную, коли бы кольвекъ была потреба водле уфалы земское соймовъ нашихъ Великаго Князства, якая на онъ часъ будетъ потреба оказовати, то есть и похожыхъ зъ именей зъ людей, яко будетъ потреба, отчызныхъ выслужоныхъ и купленныхъ…

**Артыкулъ 2.**

***О ПОСТАНОВЕНЮ ОБОРОНЫ ЗЕМСКОЕ ТОЛЬКО НА СОЙМТЬ.***

Обецуем и уставуемъ вечными часы быти держано, ижъ кгды будеть потреба противко которого непріятеля нашого обороны земское сему панству нашому Великому Князству Литовскому, албо валка вести; тогды мы сами Господаръ або и съ паны радами нашими не маемъ ани будемъ того учынити, ани серебщызны и поплату никоторую установляти, ажъ первей соймъ великій вальный зложывшы въ томъ панстве нашом Великомъ Князстве Литовскомъ, на которомъ за росказаньемъ и листы нашими будуть повинни вси княжата и панове рады духовные и свецскіе, маршалки и иные врядники земскіе и дворные, панове хоруговные, послы земскіе поветовые зъехатися; тежъ на онъ часъ на сойме великомъ вальномъ зо радами нашими и зо всими княжаты и паняты и зо всимъ рыцерствомъ порядою а позволеньемъ ихъ маемъ таковые речы становити а не иначей. А ведьже где бы отъ котораго непріятеля нашого якое прудкое уторгненье было въ се панство наше Великое Князство; тогды и безъ сойму толко за листы нашими, а въ небытности нашой за листы пановъ радъ нашихъ гетмана нашого великого мають вси князи и панове подданые нашы, войны павинны, на часъ и местце назначаное ехати, яко на кгвалтъ, и то зъ милости Речы Посполитое боронечы собе жоны и детей маетности отчызны своее.

**Артыкулъ 3.**

***О НЕВЫЗВОЛЕНЬЕ ЛИСТЫ НАШИМИ, И ТЕЖЪ КОГО ВОЛНО ВЫЗВОЛИТИ.***

Тежъ уставуемъ, ижъ мы не маемъ жаднаго зъ войны отъ службы земское такъ словнымъ росказаньемъ яко и презъ листы наши вызволити изъ войска отпущати, такъ тежъ и гетманове наши не будутъ мочы вызволити и зъ войска отпущати, кромъ тыхъ врядниковъ нашихъ и слугъ, которыхъ мы Господаръ на часъ онъ часъ для послугъ нашихъ и справъ земскихъ зоставимъ , а ведже и тые почты свои водле можности именей ихъ винны слати и выправовати …

**Артыкулъ 9.**

***О ДУХОВНЫХЪ, ЯКЪ МАЮТЬ СЛУЖБУ ЗЕМСКУЮ СЛУЖЫТИ.***

Уставуемъ тежъ и духовные зъ именей своихъ свецкихъ и костелныхъ наданыхъ, съ которыхъ служба земская военная бывала до сихъ часовъ, также зъ именей своихъ отчызныхъ купленыхъ и закупленыхъ шляхецскихъ, войне повинныхъ, службу земскую служити маютъ тымъ же

обычаемъ, направуючы съ тыхъ именей своихъ почетъ повинни при немъ слать за свою особу человека доброго шляхтича водле уфалы земское сеймовое.

## РОЗДИЛЪ ТРЕТІЙ О ВОЛЬНОСТЯХЪ ШЛЯХЕЦКИХЪ И О РОЗМНОЖЕНЬЮ ВЕЛИКОГО КНЯЗСТВА ЛИТОВСКОГО.

### АРТЫКУЛЪ 1.
### *О РОЗМНОЖЕНЬЮ ВЕЛИКОГО КНЯЗСТВА ЛИТОВСКОГО.*

Мы Господаръ обецуемъ тежъ и шлюбуемъ за себе и за потомки наши Великіе Князи Литовскіе подъ тоюжъ присегою нашою, которую есьмо учинили всимъ обывателемъ всихъ земль Великого Князства Литовского и всихъ земль ку нему здавна и теперъ належачыхъ у славе, титуле, столицы, зацность, и владзы, и можность росказованью, и въ иншыхъ свихъ належностяхъ и прислухиванью и въ границахъ ни въ чом не вменшати и о вшемъ примножати. И хотя бы панъ Богъ зъ ласки свое светое намъ Господару узычити рачылъ панства Литовского князей и пановъ радъ духовныхъ и свецскихъ и всихъ врядниковъ земскиъ и дворныхъ шляхту рыцерства и всихъ иныхъ становъ ни въ чомъ томъ не понижати, але отъ всякое легкости и пониженья, яко славное памяти продки наши, Великіе Князи Литовскіе, за щасливого панованья своего чынити стеречы и боронити бедемъ, съ помочъю Божьею стараючисе о примноженье и вывышенья того панства и всихъ становъ достойности оздобъ и пожытковъ зъ наиболшою пилностью и всилованьемъ нашимъ.

### АРТЫКУЛЪ 2.
### *О ВОЛЬНОСТЯХЪ ШЛЯХЕЦСКИХЪ.*

Тежъ мы Господар обецуемъ словомъ нашимъ за насъ и за потомки наши Великіе Князи Литовскіе подъ такимъ же обовязкомъ нашимъ, яко вышей у первомъ артыкуле естъ описано, ижъ всихъ князей и пановъ радъ, якъ духовныхъ, такъ и свецскихъ, и всехъ врядниковъ земскихъ и дворныхъ, пановъ хоруговныхъ, шляхту, рыцарство, мещане и всихъ людей посполитыхъ у Великомъ Князстве Литовскомъ и во всихъ земляхъ того панства намъ заховати при свободахъ и вольностяхъ хрестіянскихъ, въ которыхъ они, яко люде вольные, вольно обираючы изъ стародавна изъ вечныхъ своихъ продковъ собе пановъ и Господарей Великихъ Князей Литовскихъ, жыли и справовали прикладомъ и способомъ волныхъ панствъ хрестіянскихъ, ровнаючы однако маючы и тыхъ вольностей ужываючы и зъ суседы братею своею рыцерствомъ и иные станы народц Коруны Польское, и особливе на то при свободахъ и вольностяхъ и листехъ Великихъ Князей Литовскихъ, продковъ нашихъ, и отъ насъ всемъ вобец яко и кождому зособна на учтивости достоенства вряды на именья на люде на кгрунты и на што кольвекъ даныхъ, и што еще будеть даваны впередъ, непорушите неотмените (вечными часы ховати). А хтобы тежъ што хотя безъ привильевъ за отчызнымъ правомъ якимъ кольвекъ обычаемъ набытыхъ людей кгрунтовъ

своихъ въ держанью бвлъ, такъ за славного панованья продковъ нашихъ Короля его милости Казимера и Александра, яко тежъ за светое памяти и отца нашого и за нашого щастливого панованья, тые сами съ потомки ихъ близкими и теперъ то вечие держати мають и будуть.

### Артыкулъ 3.

***Мы господаръ обецуемъ розмножати Великое Князство Литовское, а штобы розобрано и одышло зась ку нему привернути.***

Тежъ добра Князства Литовского не уменшымъ и то, што будеть черезъ непрiятелей того панства нашого отдалено розобрано и ку иншому панству отъ того нашого коли кольвекъ упрошоно, ку Короне ку Мазовшу ку Прусомъ ку Ифлянтомъ, то за се ку власности того Великого Князства привести и границы оправити обецуемъ. А хотя быхъ тедъ кому заграничникомъ при границахъ тыхъ верху мененыхъ земли именья села и люди дали; тогды таковые мають съ того служыти Великому Князству Литовскому, а хтобы не хотелъ служыти, таковыхъ прывильевъ не маемъ мы и потомки наши держати.

### Артыкулъ 4.

***О неданье шляхты и ихъ именей кгрунтовъ вольностей и тежъ неданье листовъ и привильевъ сему статуту.***

Уставуесъ и вечными часы ховати и держати обецуемъ, ижъ яко продки наши Великiе Князи Литовскiе, такъ и мы незвыклые никому ни которымъ способомъ бояръ шляхецкихъ именей кгрунтовъ и земль давати, такъ и теперъ на все потомные часы обецуемъ и прирекаемъ подъ тою жъ присегою нашою, которую есьмо учинили обывательемъ сего панства нашого Великого Князства Литовского, бояръ шляхты и ихъ именей кгрунтовъ и всякое маетности и иныхъ свободъ и вольностей и правъ въ нихъ отбирати и отводити, и ни якимъ особамъ, которымъ кольве въ томъ панстве обывателемъ яко и заграничникомъ и посторонннимъ и жадному иному, давати записовати и ни которымъ способомъ отдаляти не маемъ. А где бы што одержано и вышло якимъ же кольвекъ обычаемъ противъ сего статуту; то с права и суду справедливость черезъ насъ и потомки наши за радою радъ нашихъ Великого Князства на сторону отложоно и ни во што обернено быти маеть. А про привильевъ въ посполитомъ яко и кождому зособна не маемъ ани будемъ мачы давати противъ сего статуту и артыкуловъ в немъ описаныхъ; а которые бы передъ тумъ вышли и про то съ канцляреи нашое по выдацью сего статуту отъ насъ черезъ кого кольвекъ одержаны были, таковыхъ мы и потомки наши держати не хочемъ, але справа и суду сказовати и ни во што оборочати будемъ. Ведже кому быхмо зъ ласки нашое дали и давати хотели родичомъ Великого Князства именья наши спадковые, и въ нихъ бояре хотя бы шляхта была, а именьица свои здавна и ново тежъ черезъ данину оныхъ пановъ, по комъ на насъ Господаря тые спадки пришли, (мели) и имъ служыли, а листы потверженьемъ нашимъ не вызволили, въ томъ моцы рукъ и щодробживости нашое и потомковъ нашихъ не замыкаемъ.

## Артыкулъ 5.
### *О соймикохъ поветововыхъ и о выправованью и посланью зъ нихъ пословъ земскихъ на вольный сойм.*

Уставуемъ для лепшого порадку во речахъ и въ способу ку справедливости и обороне, абы за волею всехъ на соймикахъ потребы се земкіе становили и отправованы были, абы вечными часы передъ сеймомъ великимъ вальнымъ,которымъ маемъ мы и потомки нашы завжды, коли того потреба окажеть Речы Посполитое Великого Князства, порядою радъ нашихъ тогодъ панства складати листы нашими соймики поветовые, а мановите на тыхъ местцахъ и воеводствахъ нижей суть написаныхъ и постановленныхъ, которые соймики также листы нашыми даны будуть не на близшей часъ и рокъ, толко за чотыры надели передъ соймомъ великимъ. На которые соймики мають зъежджатися и быти тые воеводове и каштелянове врядники земскіе, потомужъ князеве панове шляхта того жъ повету и воеводства, а намовляти о тыхъ речахъ и потребахъ земскихъ, которые имъ на местцахъ нашихъ ознайменены будуть, на мней тежъ о своихъ и о всехъ потребахъ хемскихъ и долеглостяхъ оного повету и воеводства; и зволившыся вси одностайнымъ зданьемъ мають обирати пословъ своихъ, то естъ отъ кождого суду земского, колко ихъ у томъ воеводстве будеть, по две особы, послати ихъ на соймъ ознаймившы и вручившы то все имъ, о чомъ водле листовъ нашихъ господарскихъ, и тежъ во всиехъ потребахъ, радити намавляти и ставити мають, даючы имъ моцъ на томъ таковомъ вальномъ сойме поступовати и кончыти тые и иншые припалые речы водле часу и потребы. Ведже князей, пановъ, маршалковъ и иныхъ всихъ урядниковъ земскихъ и дворныхъ подле старого обычаю маемъ листы нашими на таковый вальный соймъ взывати; и тые вси въ раде посполитой местца и воты свои будуть мети способомъ звычаю стародавного, а послове земскіе местца и воты свое мають мети водле порадку нижей написаного.

## Артыкулъ 6.
### *О сойму вальномъ.*

При томъ тежъ уставуемъ, съ призволеньем радъ нашихъ духовныхъ и свецкихъ и зо всими станы сойму належачыми, на теперешнем сойму великомъ Виленскомъ, хотечы то все мети вечными часы, ижъ маемъ мы и потомки наши Великіе Князи Литовскіе съ потребы Речы Посполитое за радою радъ нашихъ того жъ панства, або за прозбою рыцерства, складати сеймы вальные въ томъ же панстве Великомъ Князстве Литовскомъ завжды, коли колко того будеть потреба.

## Артыкулъ 7.
### *Абы шляхтичъ безправне не былъ иманъ ани сажонъ.*

Тежъ обецуемъ и вечными часы мети хочемъ мы Господаръ и потомки наши, ижъ все рыцерство шляхту Великого Князства при вольностяхъ звыклыхъ, которые отъ насъ Господаря и отъ продковъ нашихъ

имъ суть наданы, будемъ повинни мети заховати и держати. Тежъ кождый шляхтичъ оселый подле права позваный, непоконаный правомъ, отъ насъ Господара и отъ кождого вряду иманъ и въ везенье сажонъ быти не маеть.

## Артыкулъ 8.

### *Абы панове шляхту о почтивость ихъ сами не судили.*

Тежъ уставуемъ, ижъ княжата и панове рада наша шляхту и кождого бы зъ рицерства нашого, которые тежъ шляхту нашу служебниками въ себе ховаютъ, не маютъ сами о почтивость судити кроме насъ; бо тотъ судъ никому иному не належитъ одно Господару. А што се дотычеть злодейства и иншихъ речей выступковъ – то волни будуть панове ихъ зъ ними, осадившы при собе пред се шляхту людей добрыхъ, справедливость чынити, а въ чомъ былъ хто съ права поконанъ, тогды тотъ за выступокъ свой терпети и каранъ маеть быти бы и горломъ.

## Артыкулъ 9.

### *Ижъ достоинствъ врядовъ въ дтьдицтво чужоземцмъ давано быти не маеть.*

Такъ тежъ мы Господаръ обецуемъ и шлюбуемъ подъ присегою нашое, которую учынили есьмо Великому Князству Литовскому и всимъ captured станомъ и обывателемъ его, беручы то изъ статуту старого пана отца нашого Короля его милости тому панству Великому Князству Литьовскому, даного, а въ сесь выкладаючы и на то позволяючы, штожъ въ томъ панстве Великомъ Князстве Литовскомъ и во всихъ земляхъ ему прислухаючыхъ достойностей духовныхъ и свецкихъ городовъ жворовъ и кгрунтовъ староствъ въ держаньи и пожываньи и вечностей жадных чужоземцомъ и заграничникомъ ани суседомъ таго панства давати не маетмъ; але то все мы и потомки наши Великіе Князи Лтовскіе давати будуть повинни только Литве а Руси, ролдичомъ старожитнымъ и вродовцамъ Великаго Князства Литовского и иныхъ земль тому Великому Князству належачыхъ…

## Артыкулъ 10.

### *Достойности и вряды дывные не маютъ быти нарушоны.*

Тежъ обецуемъ и хочемъ вечными часы мети, абы панове рада наша, такъ духовные яко и свецкіе, и вси иные врядники нашы земскіе и дворные, въ томъ панстве нашомъ Великомъ Князстве Литовскомъ были во всякихъ достоенствахъ и у почтивостяхъ захованы водле двного обычаю и кождый подле зацности и местца своего. А што се дотычеть владности и справъ ихъ судовыхъ; въ томъ се они маютъ заховати и справности, яко нижей въ семъ статуте есть описано.

## Артыкулъ 11.

### *Достоенствъ и врядовъ на заочное обмовенье не маемъ одыймавати.*

Тежъ обецуемъ, ижъ достойностей всякихъ врядовъ староствъ державъ тивунствъ на справу чію кольвекъ и на обмовы заочные мы и потомки наши не мають отнимати; але коли бы который изъ врядниковъ нашихъ былъ роспрошытель або шкодникъ нашъ и дворовъ нашихъ, и до нас бы въ томъ обмовенъ и обвиненъ был; тогды обоя сторона, якъ тая хто ведетъ, такъ на кого Менитъ, мають передъ нами очевисто стати, а мы съ паны радами нашими Великого Князства Литовского, выслухавшы ихъ и розознвавшы тую речъ, винного водле выступку его карати маемъ, а безвинне и безъ права на заочное поведанье не будмъ ни в кого врядовъ брати, ани ихъ зъ нихъ рушиати.

**Артыкулъ 12.**

***О держанью старыхъ уставъ, а новыхъ безъ сейму вального не всавляти.***

Тежъ прирекаемъ вси привелея земскіе стародавные и ново отъ насъ наданые волности и звычай добрый стародавный тымъ статутомъ нашимъ ховати и ни въ чомъ ни нарушати, а нового ничого не встановляти. А ведъ же была ль бы того потреба што нового прибавити ку доброму речы посполитой; тогды того не маемъ чынити ани вставъ жадныхъ делати, ажъ на вальномъ сойме того панства нашого и въ здешнемъ панстве нашомъ Великомъ Князстве Литовскомъ, зъ ведомостью порадою радъ нашихъ и призволеньемъ всихъ земль того панства нашого.

**Артыкулъ 13.**

***О волности выеханья нашого изъ земли кромъ земль непріятельскихъ.***

Тежъ узычаемъ и уфаляемъ вечными часы, абы княжата и панове хоруговные шляхты и кождый человек рыцерскій и всякого стану того панства нашого Великого Князства Литовского мели вольность и моцъ выехати и выйтит съ тыхъ земль нашихъ Великого Князства для наукъ у письме цвиченя учынковъ рыцерскихъ и лепшаго счастья своего, и тежъ будучы неспособного здоровья своего для лекарствъ до всякихъ сторонъ и земль, кроме земль непріятелей нашихъ Московского бесурманскихъ и иншыхъ, съ кимъ тое панство наше на онъ часъ вальчыло **…**

**Артыкулъ 20.**

***О шляхть, которые бы въ мтьсть остьлость прынели.***

Тежъ уставуемъ, ижъ кгды бы шляхтичъ занехавшы именья шляхецскаго, а ищучы пожывенья, штолъ бы собе до места и мешкаючы тамъ, торгъ мескій ведучы або шынкъ въ дому маючы або ремесло робечы, понехавшы на тотъ часъ шляхецтва своего подле уставы нижей у артыкуле описаное; тогды сынове не хотели и локтемъ не мерили, а наследовали поступковъ рыцерскихъ продковъ своихъ, таковые маютъ быти за правую шляхту почытаны.

**Артыкулъ 21.**

***О простыхъ людехъ, кгдыжъ повышеня чести и становъ за годностями заслугами могут быти.***

Кождого власне рукъ и шафунку и зверхности нашое господарское належыть, и тежъ постерегаючы всякого обелженя стану шляхецкого отъ людей простого стану, окромъ сосбливое ласки и надареня отъ зверхности нашое господарское, ольности прывильевъ стану шляхецкого самъ собе прывлащати и ихъ никоторымъ обычаемъ ужывати не можеть.

**Артыкулъ 31.**

***Кнегинь, паней, дЕвокъ, вдовъ не маемъ ни за кого кгвалтомъ давати.***

Тежъ обецуемъ и приказуемъ кнегинъ, паней вдовъ, княжонъ, паненъ девокъ шляхтянокъ и всякого иного стану рожаю земского, яко людей вольныхъ подъ вольнымъ панованьемъ нашимъ господарскимъ, заховати ихъ при вольностехъ ихъ, а кгвалтомъ ни за того волно пойти.

**Артыкулъ 33.**

***Всимъ станомъ народу шляхецкого, якъ хотя, волно именьями шафовати.***

Тежъ уставуемъ, ижъ всимъ станомъ шляхецкого народу яко и людемъ вольнымъ вольно естъ и будетъ именьями своими отчизными материстыми и якимъ жъ кольвекъ обычаемъ набытыми шафавати, подле потребы воли и подобанья своего отдати, продати, записати, заставити въ долгу и въ сумахъ завести, заменяти; ведже водле того, яко о томъ шырей у розделе о записехъ естъ описано.

**Артыкулъ 39.**

***Мы Господаръ шлюбуемъ однакую справедливость всимъ чинить,***

***а передъ судомъ (у іншай рэдакцыі: «а пересуду») мы и панове рады наши брати не маемъ.***

Обецуемъ тежъ зъ ласки и добрости и милости нашой господарской ку подданнымъ нашимъ, всему рицерству Великого Князства Литовского, подъ сумненьемъ нашимъ, ижъ мы Господар и панове рада наши маемъ кождому стану всимъ заровно однакую справедливость чинить безъ отволоки, а отъ права не маемъ ничого брати; потомужъ и панове рада наша, а не маемъ тежъ стати и зычностью быти одной стороне, але просто кождому справедливость делати будемъ повинни, такъ тежъ и панове рада наши подъ присегою, которую до вчинили, справедливость чинити будеть повинни…

**Артыкулъ 41.**

***О невывоженью приправъ военныхъ до земли непріятельское.***

Уставуемъ и вечными то часы мети хочемъ, постерегаючи того, абы зо всихъ земль панства нашого Великого Князства Литовского яко жидове

татарове купцы и вси подданые наши, которого кольвекъ стану, явне и таемне всякихъ броней железа ручницъ нажовъ стрелъ и всякого иншого наряду военного не выпущали и не вывозили, посломъ не продавали, съ чого бы непріятель силитись могъ **…**

## РОЗДЕЛЪ 4-й О СУДЬЯХЪ И О СУДЕХЪ.

### АРТЫКУЛЪ 1.
***О ВЫБИРАНЬЮ СУДЕЙ ВЪ ПОВЕТЕ.***

Уставуемъ, ижъвъ тыхъ поветехъ, которые суть нижей росписаны, и въ кождомъ таковомъ повете, где еще до сихъ часовъ не обраны, зособна мають быти судья подсудокъ и писаръ, которые такъ и тымъ обычаемъ мають быть выбраны и на таковые уряды установлены. На первей маемъ мы Господаръ часъ певный зложити и то листы нашими по всихъ таковыхъ поветехъ ознаймити, где въ кождомъ повете княжата панове рада наша, также рицерство и шляхта вси, хто кольвекъ якого стану будетъ тамъ именья свои мети, зъехатися мають до двора, которій на посродку того повету будетъ, и тые которые ся зъедутъ не ждучи никого, хтобы въ повете именье маючи пріехати не хотелъ, ку тому року мають выбрати зо всее шляхты того повету братьи своее на кождый врядъ таковый, на судейство чотырохъ людей добрихъ, на подсудство другихъ чотырохъ, на писарство третихъ чотырохъ людей добрихъ, цнотливыхъ, ростропныхъ въ праве у местныхъ, роду шляхецкого, въ томъ повете добреоселыхъ, не иное веры только Хрестіянское; и выбравшы ихъ, тыхъ выбраныхъ черезъ листы свои намъ Господарю ознаймити мають, а мы съ тыхъ всихъ дванадцати особъ выберемъ трехъ до того повету на врядъ земскій, на судъ судою и подсудка и писара. Которіе отъ насъ выбраные и потверженые на першыхъ рокохъ судовыхъ передъ поветовымъ воеводою, або въ небытности воеводиной передъ кашталяны, а въ земли Жомонтской передъ старостою Жомоитскимъ, при зобранью шляхты, што ихъ тамъ въ томъ часе судеть, маеть судья подсудокъ и писаръ присегнути тыми словы:

Я присегаю Пану Богу во Троицы единому, ижъ въ томъ повете водле Бога справедливе подле права и статута сего писаного Великого Князства Литовского, водлугъ жалобы и отпору, ничого не прикладаючи ани уймуючи, буду сознавати и записы пріймовати, не фолкгуючи высокимъ и подлымъ станомъ на достойностяхъ и на врядехъ седячимъ, на богатого ани на вбогого, на пріятеля кровного заховалого, ани на ту тутошнего, не на гостя не смотречи, не съ пріязни не зъ вазни не зъ боязни не за посулы и дары, ани сподеваючися на потомъ дарованья и якого нагороженья, и не радечи стороне, а ни боячися казни помсты и погрозокъ, але самого Бога и его светую справедливость и право посполитое и сумненье свое передъ очима маючи, тежъ роковъ николи не омешкиваючи, кромъ великое правдивое и зложное хоробы; а якъ то справедливе присегаю Богу, такъ ми Боже помози; а естли несправедливе,- Боже ми не поможы.

А писаръ земскій маеть по Руску литерами и словы Рускими вси листы и позвы писати, а не иншымъ языкомъ и словы, и такъ маеть писаръ присегати:

Я, N, присегаю Пану Богу въ Троицы единому на томъ, ижъ справедливе водле Бога и того права писаного и подлугъ мовенья и споровъ сторонъ, ничего не прикладаючы ани уймуючы, у суду записовати и радити судьи и подсудку верне и справедливе, подле сознанья сторонъ и споровъ на судехъ и осведченья и оповеданья судового и сказанья судового, и въ книги судовые вписовати быду а пислновати и догледовати, абы подле сее присегеи моее справедливе были вписаваны, не маючы баченья не высокіе а ни подлые станы на достойностяхъ седячыхъ, на богатого, ани на вбогого на пріятеля кровного заховалого, ани на непріятеля, на тутошнего, ани на гостя, не съ пріязни не зъ вазни не за посулы и дары, а не боечыся вазни и помсты и погрозокъ, не ждучы нагороженья, але самого Бога и его светую справедливость и право посполитое передъ очима маючы, и сумненье свое добре а побожие справуючы, такъ ми Боже поможы.

А потомъ, кгды бы который съ тыхъ на початку и знову отъ насъ теперъ выбраные умеръ, судья, подсудокъ, або писаръ, а трафило се бы то въ небытности нашой; тогды тые, которые на тыхъ урядехъ зостануть, мають о томъ дати знати воеводе своему, а въ земли Жомоитской старосте Жомоитскому; а воевода маеть черезъ листы свои старостамъ и шляхте того повету, а староста Жомоитскій тивуномъ шляхте и всякого стану оное Жимоитское земли обывателемъ часъ зложити, на который зъехавшися вси станы оного повету и до такового двору нашого, яко вышей описано, мають на местце того умерлого чотырохъ особъ таковыхъ же, яко первымъ выменено, обрати и намъ черезъ листы свои отворотные за печатью воеводиною ознаймить; а мы потомъ съ тыхъ чотырохъ одного, который се намъ видети будеть, выбравшы на местце того умерлого судьи подсудка або писара, которого съ тыхъ въ тотъ часъ потребовати будуть, не отволочие установити. А где бы на судство обрали подсудка або писара земского; тогды на тое местце тамъ же за разомъ на тотъ врядъ обобравшы къ намъ послати мають; а тотъ, кому тотъ врядъ дамо, потомъ на першыхъ рокохъ судовыхъ будеть повиненъ первей на местцу тамъ передъ тымъ воеводою або кашталяномъ и передъ старостою оного суду такъ, яко вышей описано, присегнути, тожъ потомъ врядомъ своимъ владнути и справовати. И такъ мають вжо вечными часы въ поветехъ около выбранья тых врядниковъ справоватися и захавати.

## Артыкулъ 8.

### *О судьяхъ, якіе мають быти обираны.*

Уставуемъ, ижъ на тые вряды яко на судейство на подсудковство и писарство не мають быти выбираны духовные особы, а ни сторостове державцы, а ни тивунове того повету, ани хоружые и ни хто таковый, хтобы

въ томъ повете нашомъ врядникомъ былъ; але таковые и такъ мають быти выбираны яко вышей описано.

**АРТЫКУЛЪ 33.**

***ХТОБЫ САМЪ НЕ МОГЪ, АБО НЕ УМЕЛЪ У ПРАВА МОВИТИ.***

… Къ тому кгды бы хто, не могучы самъ справовати речы своее у суда и не вмеючы мовити, прокуратора потребовалъ; тогды судъ повиненъ ему зъ уряду прокуратора дати, и казати прокуратору отъ него мовити, а речъ его справовати. А въ вображенью маестату нашого господарского обецуемъ прокуратора обвиненой стороне дати. За се будеть повиненъ судъ зъ ураду дати прокуратора, и дармо казати ему мовити отъ убогихъ сиротъ и вдовъ немаетныхъ и тымъ тежъ, которыи бы або за пріязнью або тежъ убозтвомъ своимъ прокуратора мети и сами речы своее за недостаткомъ своимъ въ суду справовати не могли.

**АРТЫКУЛЪ 38.**

***ИЖЪ НИХТО СЪ БРОНЯМИ ПЕРЕДЪ СУДЪ ПРИХОДИТИТ НЕ МАЕТЬ.***

Уставуемъ тежъ грозно приказуючы, абы нихто съ подданыхъ нашихъ княжатъ пановъ радъ,почоншы отъ вышшого ажъ до нижшого стану, яко сами панове такъ и слуги ихъ при панахъ своихъ и безъ пановъ пріятель за пріятелемъ, не смелъ въ зброяхъ кафтанахъ и съ такими бронями, то естъ съ древомъ зо щепомъ зъ ручницою зъ лукомъ и съ кушою и зъ иными всякими, до суду замкового земского приходити и при собе мети; а ведже кордъ и мечъ то при собе мети можеть и носити…

## РОЗДЕЛЪ ПЯТЫЙ О ПРАВЕ ПОСАГОУ.

**АРТЫКУЛЪ 1.**

***КОТОРОМЪ ОБЫЧАЕМЪ ОТЕЦЪ ВЫДАЮЧЫ ДЕВКУ СВОЮ ЗАМУЖЪ МАЕТЬ ОБВАРОВАТИ И ВПЕВНИТИ ЗАПИСАНЬЯ ВЕНА ОТЪ ЗЯТЯ.***

Тежъ уставуемъ, ижъ кождый обыватель того панства которого кольвекъ будучы стану, выдаючы дочку свою замужъ и даючи за нею посагъ або выправу подле доброе воли своее, наипервей нижли девку выдастъ, маеть отъ зятя взяти записъ подъ печатью его и подъ печатьми людей добрихъ, которымъ онъ на третей части именья своего лежачого оный посагъ або выправку совито описати маеть потомужъ яко нижей описано; а потомъ оный записъ тотъ же зять на первыхъ рокохъ земскихъ передъ судомъ земскимъ оного повету, въ которомъ оселости маеть, оповедати и въ кники земскіе записати маеть, таковая отправа маеть быти въ кождого права задержана…

**АРТЫКУЛЪ 18.**

***О РОЗВОДЕХЪ МАЛЖЕНСКИХЪ ПЕРЕДЪ СУДОМЪ ДУХОВНЫМЪ.***

Тежъ уставуемъ, ижъ розводъ малженскій маеть быти передъ судомъ духовнымъ обоего стану водле правъ нашихъ хрестіянскихъ: если мужъ зостанеть виненъ зъ розсудку права духовного, тогды жона останеть на

оправе отъ него описаной; а пакли бы жона винна найдена, тогды внесенье и оправу свою тратить. А ведже если бы розводъ слушный доводомъ для кревности, ижъ ся малженство въ неведомости кревности стало, або для иншыхъ причынъ, которые бы се передъ правомъ духовнымъ показали, ижъ бы слушный розводъ мелъ быти; тогды при розводе венокъ при мужу и внесенье при жоне зостати маеть.

## РОЗДЕЛЪ СЕМЫЙ О ЗАПИСЕХЪ И ПРОДАЖАХЪ.

### Артыкулъ 1.

***О ЗАПИСЕХЪ НА ИМЕНЬЯ СВОИ ОТЧЫЗНЫЕ И МАТЕРИСТЫЕ.***

… Што вси отъ сего часу и дня волно и моцно кождому именья свои отчызные и земскіе материстые и выслужоные купленые и якимъ кольвекъ обычаемъ набытые и названые, не смотречы третее и двохъ частей, яко передъ тымъ бывало въ статуте обычаемъ стародавнымъ, але все съ домомъ, хто ихъ што маеть, будь тежъ половицу або и которую ихъ часть, и по собе и у одно або люди земли, што хотя отъ нихъ водле доброе воли своее и мысли, отдати продати даровати и записати заставити, отъ детей и близкихъ отдалити, подле баченья своего тымъ шафовати…

## РОЗДЕЛЪ ОСМЫЙ О ТЕСТАМЕНТЕХЪ.

### Артыкулъ 1.

***ХТО МОЖЕТЬ И НЕ МОЖЕТЬ О РЕЧАХЪ СВОИХЪ РУХОМЫХЪ ТЕСТАМЕНТЪ ЧИНИТИ.***

Уставуемъ, ижъ кождый маеть мети моцъ о речахъ своихъ рухомыхъ тестаментъ чинити, кромъ тыхъ парсунъ нижей описаныхъ, котрые парсуны ижъ подле права не маютъ ничого вольного, для того тестаментомъ никому ничого отдачи не могуть: наипервей дети летъ зупольныхъ не маючіе, законники будучи въ законе не привильеваномъ, принемши и потвердившиеся въ законе, сынове зъ отцемъ недельные окромъ речей набытья своего властного або выслугъ, бо тежъ въ чужую мацъ поданые, то естъ тотъ кого бы кому выдано зъ его статки, шаленые, кацеры, невольники, отъ розуму отходячіе, а ведьже тые, коли къ собе прійдут, моцны тастаментъ своей чинити, такъ тежъ и чти отсужоные не могуть тестаментовъ чинити.

### Артыкулъ 4.

***НИ ХТО НЕ МОЖЕТЬ НЕВОЛЬНИКУ СВОЕМУ НИЧОГО ЗАПИСАТИ, ВОЛЬНЫМЪ НЕ ВЫИНИВШИ.***

Уставуемъ, ижъ кождый якого кольвекъ стану невольнику своему, не вчинившы его на передъ вольнымъ, ничого тестаментомъ записати не может, абы его первей вольнымъ учинилъ. А ведже тестаментомъ ижъ каждымъ листомъ явнымъ можетъ невольника своего вольнымъ учынити, а учинившы, тымъ же тестаментомъ можеть ему што рухомого водле воли своее записати.

## РОЗДЕЛЪ ДЕВЯТЫЙ О ПРАВАХЪ ЗЕМСКИХЪ.

### АРТЫКУЛЪ 8.

***ХТО БУДУЧИ УРЯДНИКОМЪ ГОСПОДАРСКИМЪ, МАЮЧЫ ИМЕНЬЕ ВЪ ТОМЪ ПОВЕТЕ, МЕЛЪ ЗЪ ШЛЯХТИЧОМЪ ПРАВО О ЗЕМЛЮ.***

Тымъ тежъ обычаемъ если бы который урядникъ нашъ, маючы именье въ томъ же повете державы своей, мелъ зъ которымъ шляхтичомъ копу вести; теды маеть справоватьсе о кгрунтъ земный, яко вышей описано, и маеть ставить осмнадцать сведковъ шляхту и иншихъ людей добрыхъ веры годныхъ, а не того уряду присуду своего, але иншихъ посторонниххъ, и такъ тежъ судьи мають гледеть листовъ границъ знаковъ, а чыи будуть листы лепшые и границы, тая сторона маеть быти припущона ку доводу.

## РАЗДЕЛЪ ДВАНАДЦАТЫЙ Й НАВЕЗКАХЪ ЛЮДЕЙ ПОСПОЛИТЫХЪ.

### АРТЫКУЛЪ 5.

***ЖИДЪ, ТАТАРИНЪ И КОЖДЫЙ БЕСУРМАНИНЪ НА ВРЯДЪ ПРЕЛОЖОНЪ И ХРЕСТІЯНИНЪ ВЪ НЕВОЛИ МЕТИ НЕ МАЕТЬ.***

Уставуемъ, ижъ отъ того часу мети хочемъ, абы жидъ, татаринъ и кождый бесурманинъ на достоенство а ни на который врядъ отъ насъ Господаря а ни отъ пановъ радъ нашихъ преложонъ не былъ и хрестіянъ въ неволи не мелъ …

### АРТЫКУЛЪ 7.

***ЧЕЛОВЕКЪ ВОЛЬНЫЙ ЗА ЖАДЕНЪ ВЫСТУПОКЪ ВЪ НЕВОЛЮ ВЫДАНЪ БЫТИ НЕ МАЕТЬ.***

Тежъ уставуемъ, ижъ человекъ волный за жадный выступокъ въ неволю вечную выданъ быти не маеть, а естли бы въ суме великой выданъ былъ; маеть съ тое сумы выроблятися, и выпуску на каждый годъ мужику полтина, а жонце пол-копы грошей …

### АРТЫКУЛЪ 11.

***О ВОЛЬНЫХЪ ЛЮДЕХЪ, КОТОРЫЕ ВЪ ГОЛОДЪ ПРОДАЮТЬ.***

Хто бы въ голодъ самъ себе або сына або тежъ которого человека вольного въ неволю продалъ, и листъ на то далъ; таковый листъ не маеть быти держанъ, але яко голодъ минеть, а онъ пенезей добудеть, маеть ему пенези отжати …

## РОЗДЕЛЪ ЧОТЫРНАДЦАТЫЙ О ЗЛОДЕЙСТВЕ ВСЯКОГО СТАНУ.

### АРТЫКУЛЪ 8.

***О ШЛЯХТИЧУ ЛЕТЬ ЗАПОЛНЫХЪ НЕ МАЮЧОМУ.***

Естли бы се трафило, ижъ бы шлихтичъ въ летехъ чотырнадцати и не больше обвиненъ о злодейство, або приведенъ былъ о злодейество зъ лицомъ передъ врядъ; тогды таковому про молодость летъ его не маеть быти поличоно за злодейство, и не маеть быти до ката въ руки и на муку даванъ, нижли тую шкоду отецъ его або матка кровные зъ именья части его повинни зъ навезкою платити, и заплативши то почтивости его шкодити не маеть, а не будеть ли мети чимъ платити, ино давати его на выслугу, поки бы то заслужилъ, што зашкодилъ. Тымъ же тежъ обычаемъ можеть се розумети и о детехъ людей простыхъ летъ недорослыхъ. А ведьже и таковый хлопецъ недорослый естьли бы въ колку злодействахъ и при лицы былъ дознанъ, таковыхъ врядъ маеть карати водле званья своего.

## 7. КАМЕНТАРЫІ ДА СТАТУТА 1566 ГОДА

### *Раздзел 1*

**Арт.25.** Закон забараняе ўстанаўліваць у Вялікім княстве Літоўскім новыя мытні. Дазвалялася дзейнічаць толькі тым мытням, якія існавалі са старажытных часоў і на якія існавалі спецыяльныя граматы, выдадзеныя папярэднімі вялікімі князямі. За парадкам збору мытных падаткаў павінна была наглядаць мясцовая адміністрацыя. Яна таксама наглядала і за парадкам на судаходных рэках.

**Арт.26.** Упершыню у статутавым заканадаўстве артыкул дазваляе шляхце свабодна перамяшчацца па тэрыторыі дзяржавы, як па сушы, так і па вадзе, з мэтай продажу ўласнага збожжа (не купленага). Шляхта пры гэтым вызвалялася ад мытнага і маставога збору.

### *Раздзел 2*

**Арт.1.** Рэгламентуецца воінскі абавязак з пералічэннем кола асоб, якія пры дасягненні паўналецця паводле пастановы сойма павінны несці воінскую службу.

**Арт.2.** Замацоўваецца кампетэнцыя сойма адносна падаткаў і збораў на ваенныя патрэбы, а таксама абавязак усіх падданых дзяржавы без пастановы сойма, а ў адпаведнасці з вялікакняжацкім лістом ехаць на вайну ў выпадку раптоўнага нападу непрыяцеля.

**Арт.3.** Вялікі князь абавязваецца нікога не вызваляць (вусным распараджэннем ці спецыяльным лістом) ад воінскай службы.

**Арт.9.** Устанаўліваецца, што духоўныя асобы таксама нясуць воінскую службу па пастанове сойма дзяржавы.

### *Раздзел 3*

**Арт.1.** Дапаўняюцца і развіваюцца палажэнні арт.1 трэцяга раздзела Статута 1529 года. Вялікі князь абяцае пад прысягай, якую даў усім жыхарам дзяржавы, клапаціцца аб захаванні іх правоў, імкнуцца к павелічэнню правоў усіх станаў, а таксама аберагаць суверэнітэт дзяржавы і клапаціцца аб яе узвышэнні.

**Арт.2.** Гаспадар абяцае ад свайго імя і ад імя папярэдніх вялікіх князёў усіх феадалаў (духоўных і свецкіх), усіх службоўцаў, шляхту, гараджан і усіх людзей "паспалітых" захоўваць пры свабодах і вольнасцях хрысціянскіх.

**Арт.3.** Развіваюцца і дапаўняюцца палажэнні арт.2 трэцяга раздзела Статута 1529 года. Гаспадар абяцае не толькі захоўваць тэрытарыяльную цэласнасць дзяржавы, але і удакладняе, з якіх дзяржаў (з Польшчы, Мазовіі, Прусіі, Інфляндыі) неабходна вярнуць "упрошаныя" раней землі Вялікага княства Літоўскага.

**Арт.4.** Вялікі князь абяцае ўсім жыхарам дзяржавы па прыкладу іншых хрысціянскіх дзяржаў захоўваць іх пры свабодах і вольнасцях, не адымаць у іх зямель, пасад, правоў, дарчых грамат і інш.

**Арт.5.** Упершыню у статутавым заканадаўстве гаворыцца аб дзейнасці павятовых соймікаў – агульных сходаў павятовай шляхты, якія склікаліся за чатыры тыдні перед пачаткам працы вальнага сойма. Соймікі сведчылі аб новых дэмакратычных тэндэнцыях у дзяржаве. На іх павятовая шляхта выбірала са свайго асяроддзя па два дэпутаты на сойм, абмяркоўвала розныя мясцовыя пытанні. а таксама тыя пытанні, якія павінны былі разглядацца на сойме, давала наказы дэпутатам і інш.

**Арт.6.** Упершыню статутавай нормай рэгламентуецца дзейнасць сойма, які склікаецца па меры патрэбы па ініцыятыве паноў радных і шляхты.

**Арт.7.** У кантэксце павелічэння правоў шляхты забараняецца турэмнае зняволенне прызванага да суда шляхціца да таго часу, пакуль ён не будзе прызнаны вінаватым у судовым парадку.

**Арт.8.** Рэгламентуецца падсуднасць вялікакняжацкаму (гаспадарскаму) суду спраў, якія тычыліся шляхецкага гонару, за выключэннем некаторых спраў (крадзеж і і нш.).

**Арт.9.** Чужаземцам забаранялася (як і ў папярэдніх заканадаўчых актах) даваць землі і пасады ў Вялікім княстве Літоўскім.

**Арт.10.** Князь абяцае захоўваць вышэйшых службовых асоб дзяржавы пры іх пасадах і ў павазе. Удакладняецца, што іх дзейнасць павінна ажыццяўляцца ў адпаведнасці са статутавымі нормамі.

**Арт.11.** Паўтараюцца палажэнні папярэдніх заканадаўчых актаў адносна таго, што вялікі князь па завочному абвінавачванню не будзе нікога судзіць і пазбаўляць пасад.

**Арт.12.** Удакладняюцца палажэнні арт.6 гэтага раздзела. Упершыню статутавая норма прама замацоўвае заканадаўчую функцыю сойма і гаворыць, што новыя законы прымаюцца толькі на вальным сойме.

**Арт.13.** Паўтараючы і развіваючы палажэнні папярэдніх заканадаўчых актаў (граматы Казіміра 1447 года, Полацкай граматы 1511 года і інш., а таксама Статута 1529 года), дазваляецца ўсім жыхарам Вялікага княства Літоўскага свабодна выязджаць за межы дзяржавы, акрамя непрыяцельскіх зямель, з якімі Княства знаходзілася у стане вайны.

**Арт.20.** Шляхціцы, якія займаліся рамяством і гандлем, пазбаўляліся шляхецкага стану. Сыны ж іх, калі не займаліся рамяством і гандлем, павінны былі прызнавацца сапраўднымі шляхціцамі.

**Арт.21.** Удакладняючы палажэнні арт.15 дадзенага раздзела, дзе гаварылася, што простых людзей нельга павышать над шляхтай, гаворыцца, што ніхто самавольна не можа прысвоіць сабе шляхецкае званне.

**Арт.31.** У больш дакладнай юрыдычнай форме паўтараюцца палажэнні папярэдніх заканадаўчых актаў. Гаворыцца, што жанчыны ў Вялікім княстве Літоўскім (у параўнанні з папяпярэднімі законамі дадаецца: «усякага стану») захоўваюцца пры іх вольнасцях і маюць права свабодна, па свайму жаданню выходзіць замуж.

**Арт.33.** Палажэнні артыкула сведчаць аб зараджэнні буржуазных праваадносін у дзяржаве. Упершыню закон рэгламентуе права ўсіх людзей, належачых да сасло'ўя шляхты, свабодна распараджацца зямлей (па Статутату 1529 года дазвалялася упершыню распараджацца 1/3 часткай нерухомасці).

**Арт.39**. Удакладняюцца папярэднія палажэнні Статута, абвяшчаюцца прынцыпы справядлівасці і неадкладнасці разгляду судовых спраў адносна ўсіх падданых дзяржавы.

**Арт.41.** Забараняецца вывозіць зброю з тэрыторыі дзяржавы.

## *Раздзел 4*

**Арт.1.** Упершыню статутавымі нормамі рэгламентуюцца прынцыпы выбарнасці суддзяў і аддзялення судовай улады ад выканаўчай (упершыню гэта было замацавана на Бельскім сойме прывілеям 1564 года).Вызначаецца парадак прыняцця судовай пасады. Прыводзіцца тэкст прысягі суддзяў, якую яны прыносілі на першай судовай сесіі пры ўступленні на пасаду і ў якой гаварылася, што суддзі павінны дзейнічаць у межах закона, судзіць сумленна і справядліва, нікога не баючыся і не звяртаючы ўвагі на тытулы, пасады, багацце тых ці іншых асоб і інш.

**Арт.8.** Забараняецца выбіраць суддзямі ў земскія суды прадстаўнікоў духавенства і службовых асоб мясцовай адміністрацыі.

**Арт.33.** Замацоўваецца права чалавека на абарону сваіх правоў у судовым парадку з дапамогай адваката. Закон удакладняе, што кожная асоба можа патрабаваць ад суда прызначыць адваката, а бедным людзям, сіратам і ўдовам адвакаты павінны прызначацца бясплатна.

**Арт.38.** Закон клапаціўся аб ахове судовай улады і патрабаваў яе паважаць.Усялякамі сродкамі стрымліваліся намеры на замах на яе. Так, забаранялася ўваходзіць узброеным у судовую залу ( за выключэннем халоднай зброі, якую меў кожны шляхціц). Аб абароне судовай улады, ахове суддзяў сведчаць шматлікія артыкулы гэтага раздзела (39 – 43 і інш.).

## *Раздзел 5.*

**Арт.1.** Закон клапаціўся аб абароне правоў жанчын. Артыкул сведчыць аб матэрыяльным забеспячэнні жанчыны. Перш чым аддаць дачку замуж

бацька павінен быў патрабаваць ад зяця аформіць спецыяльным лістом на карысць сваёй дачкі пэўную частку нерухомай маёмасці (т.зв. вена, як правіла афармлялася на 1/3 частку маёмасці). Гэта маёмасць заставалася жанчыне і ў выпадку смерці мужа.

**Арт.18.** Гаворыцца аб разводах, якія здзяйсняліся духоўным судом, а матэрыяльныя наступствы якіх залежалі не толькі ад віны жонкі, але і ад віны мужа.

***Раздзел 7.***

**Арт.1.** Дапаўняюцца палажэнні арт.33 трэцяга раздзела адносна права свабоднага распараджэння маёмасцю. Рэгламентуецца парадак рэалізацыі гэтага права.

***Раздзел 8.***

**Арт.1.** Замацоўваецца права кожнага чалавека свабодна завяшчаць маёмасць. Выключэнне складалі непаўналетнія асобы, псіхічна хворыя і некаторыя іншыя.

**Арт.4**. Заканадаўца адмоўна ставіцца да самога паняцця «няволя». Законам дазваляецца нават завяшчаць нявольнікам маёмасць, аднак папярэдне патрэбна было аформіць вольную.

***Раздзел 9***

**Арт.8.** Гэты артыкул, як і іншыя артыкулы дадзенага раздзела, сведчаць аб імкненні заканадаўцы ахоўваць прыроду і яе багацці.

***Раздзел 12***

**Арт.5.** Забаранялася трымаць у няволі хрысціян асобам нехрысціянскага веравызнання.

**Арт.7.** Свабоднага чалавека ні за якае злачынства нельга было аддаваць у вечную няволю. Рэгламентавалася такса адпрацоўкі крымінальнага штрафа, асобна для мужчын і жанчын.

**Арт.11.** Афармленне запісам у галодны год вольнага чалавека ў няволю лічылася несапраўдным.

**Раздзел 14**

**Арт.8.** Упершыню закон рэгламентуе ўзрост крымінальнай адказнасці асобы – з 14 гадоў. Непаўналетнія асобы, як правіла, не належылі крымінальнаму пакаранню.

## 8. СТАТУТ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА 1588 ГОДА
## (вытрымкі з выдання: Статут Вялікагя княства Літоўскага 1588: Тэксты.Давед.Камент.-Мн.: БелСЭ, 1989.)

**Прывілей на выключнае права Льва Сапегі выдаваць Статут Вялікага княства Літоўскага 1588 года**

Жигимонт Третий, божъю милостью король польский, великий князь литовский, руский, пруский, жомоитъский, мазовецкий, ифляньтский, тою ж божъю милостью назначоный король шведский, готский, вандальский и великое княже финляндское и иных.

Чиним явно сим нашим листом всим посполите и кождому зособна нынешним и напотом будучим, иж панове рады и врядники наши и послы Великого князства Литовского, на сойме вальном щасливое коронацыи нашое будучи, именем всих станов обывателев Великого князства Литовского подали нам ку потверженью статут, то ест порядок отправованья судов, через депутаты от стану Великого князства Литовского и на соймикох поветовых на то обраных и высажоных поправленый, на сойме елекцеи нашое под Варшевою прогледаный, просечы, абыхмо тот статут от них новопоправленый при иньших правах и вольностях их привильем нашимъ потвердили и всим станом Великого князства Литовского выдати и ку ужыванью привести велели, указуючи нам с констытуций и уфал соймовых, жесмы то учинити повиньи.

…тот статут права Великого князства Литовского новопоправленый сим прывильем нашим ствержаем и всим станом Великого князства Литовского ку уживанью на вси потомные часы выдаем. Водле которого вже якосмы сами, господар, так и вси иные станы, обыватели Великого князства Литовского, заховатисе маем и под тою ж присегою нашою, которую есмо на вси права и вольности Великого князства Литовского учинили, шлюбуем и обецуем и вжо во всих землях и поветех, врядех и судех вшеляких до Великого князства Литовского належачих, вси справы судовые порядком, в том статуте новопоправленым описаным, отправовати почати мають в року пришлом тисеча пятьсот осмдесят девятом …

**Прысвячэнне Статута Жыгімонту III**

… А прото он великий и зацный философ греческий арыстотелес поведил, же там бельлуа, а по-нашому дикое звера, пануеть, где чоловек водлуг уподобанья своего владность свою ростегаеть. А где опять право або статут гору маеть, там сам бог всим владнеть…

… Леч иж не всих так прироженье справило, абы большей розуму, анижли маетностей своих а бестыяльских популливостей наследовати мели, тое удило або монштук на зуфальцы пан бог и право его светое вложило, абы тые за неучстивые справы свои слушное каранье, а цнотливые пристойную заплату относили. И тот то ест цель и конец всих прав на свете, тым все панства и королевства стоять и в целости своей захованы бывають, где лихие помсту, а добрые заплату относять. Чого иж се завжды тые лекають, которым

своя мила воля, а розум им неприетелем. Ради бы тое удило з себе скинули, а права все, абы им не пановали, ради бы внивеч обернули.

## Зварот Льва Сапегі да ўсіх саслоўяў Вялікага княства Літоўскага

Обачывали то усих веков люди мудрые, же в кождой речы посполитой чоловеку почстивому ничого не маеть быти дорожшого над вольность. А неволею так се маеть гыдити, же не только скарбами, але и смертью ее од себе отганяти есть повинен. А прото люди почстивые не только маетности, але и горл своих против кождому неприятелю выносити не жалують, абы под их окрутное опанованье не приходили, а з волности своее будучи злуплени, водлуг воли и мысли их яко невольники не мусели жити. Але вже мало бы на том было, ижбы чоловек з неволи от посторонного неприятеля был волен, гды бы домового неприятеля над собою терпети мусел. Тогды тот монштук або удило на погамованъе кождого зуфальцу есть вынайдено, абы се боячы права от кождого гвалту и збытку погамовал, а над слабшим и худшим не паствилсе и утискати его не мог, бо для того права суть постановлены, абы можному и потужному не все было вольно чынити. Яко Цыцеро поведил, иж естесмо невольниками прав для того, абысьмы вольности уживати могли. А естли ж чоловеку почстивому ничого нет мильшого над тое, гды во отчызне своей безпечне мешкаючы не боитсе, абы его хто на доброй славе его не змазати альбо на теле и на здоровъю его образити альбо теж на власной маетности его укрывдити мог. Тогды то ничому иншому, одно праву причитати маеть, за которым од кождого в покою седить, а жадного усилства, обельженья и укривженья на собе не поносить, бо тот цель и скуток усих прав ест и маеть быти на свете, абы кождый добрую славу свою, здоровъе и маетность в целости мел, а на том всем жадного ущирбку не терпел. И то есть наша вольность, которою се мы межи иншыми народы хрестиянскими хвалим же пана, ижбы водле воли своее, а не водле прав наших пановал, над собою не маем, а яко славы учстивое, так живота и маетности волно уживаем. Бо хто бы кольвек с тых трох речей в чом нас укривдити и подлуг уподобанья своего, а не водле прав наших над нами паствитисе мел, тот бы вжо не паном нашим, але сказителем прав и вольностей наших был, а мы бысмо неволниками его быти мусем. И слушне за правду маем, за што пану богу дяковати, же по панованьем королей их милости и великих князей, панов наших тую владзу и вольность у руках своих маем, а права сами собе творачы яко найбольшей можем волности своее во всем постерегаем, бо не только сусед а сполный наш обыватель в отчизне, але и сам господар пан наш жадное звирхности над нами заживати не можеть, одно только, колько ему право допущаеть. Прото маючи таковый скарб в руках наших, который жадною сумою преплачон быти не можеть, пристоить кождому почстивому чоловеку, абы о нём ведал, а будучи добре ведомый, абы яко сам себе и попудливости свои гамовал и водлуг права писаного справовалсе, а никого не кривдил. Так если бы од кого был укривжон, абы ведал, где обороны и лекарства в кривде своей искати маеть, бо яко один сенатор рымский другого штрофовал, же права отчизны своее не

умел, так кождый обыватель годен ест наганенья, который вольностью се фалить и прав своих умети и розумети не хочеть, которым правом усю вольность свою обварованую маеть. А если которому народу встыд прав своих не умети, поготовю нам, которые не обчым яким языком, але своим власным права списаные маем и кождого часу, чого нам потреба ку отпору всякое кривды, ведати можем. А иж тая трудность перед тым непомалу до того заважала, же не кождый статут мог мети для трудного и долгого переписованья, тогды и в том той потребе кождого обывателя фольгуючы и пожитку речы посполитое служечы, важыломсе того тую працу на себе подняти а кошту и накладу своего не жалуючы, абых то в друк подал а дорогу лацнейшую и снаднейшую кождому ку ведомости права показал. Гды ж то вжо в руках своих кождый, коли похочеть, мети можеть. Прошу рачте ж ваши милости, тую працу от мене вдячне приняти, а маючы вольности свои, правом добре обварованые, того постерегати, абысте до судов и до трибуналов не только людей добрых а тых прав нашихъ добре умеетных обирали, але боящыхсе пана бога и цнотливых, которые бы не для пожытку своего а ку шкоде ближнего, для лакомства своего и для подарков права выкручали, але простым трыбом идучы, светое правды и справедливости постерегали, а тую вольность, которою се тешимо, в целости нам заховали. С тым се ласце и милости ваших милостей братерской поручаю.

## РОЗДЕЛ ПЕРВЫЙ: О ПЕРСОНЕ НАШОЙ ГОСПОДАРСКОЙ

### АРТЫКУЛ 1

***Вси обыватели Великого князства Литовского тым одным правом писаным и от нас даным сужоны быти мають.***

Напрод мы, господар, обецуем и шлюбуем под тою ж присегою, которую учынили есмо всим обывателем всих земль паньства нашого Великого князства Литовского, иж всих княжат, панов рад, духовных и светских, панов хоруговных, шляхту, места и всих подданных наших и всих станов в том паньстве нашом Великом князстве Литовском и иных всих земль, здавна ку тому паньству прислухаючых, почоншы от вышшого стану аж до нижшого, тыми одными правы и артыкулы, в том же статуте нижей писаными и от нас даными, судити и справовати маем. Также чужоземцы заграничники Великого князства Литовского, прыеждчые и яким кольвек обычаем прибылые люди, тым же правом мають быть сужоны и на тых врядех, где хто выступить.

### *АРТЫКУЛ 2*

***Мы, господар, шлюбуем никого не карати на заочное поведанье, хотя бы дотыкалося маестату нашого господарского ображенья або здрады речы посполитое. А хто бы теж на кого што несправедливе в тых речах вел около ображенья маестату нашого господарского або здрады речы посполитое, а не довел, тым сам каран быти маеть.***

Теж предречоным прелатом, княжатом, паном радам, духовным и светским, паном хоруговным, шляхте и местам земль Великого князства Литовского и всих иных земль, здавна и тепер до того паньства Великого князства Литовского належачых, обецуем словом нашым господарским, иж на жадного чоловека выданье або осоченье явное, таемное подозренье тых станов вышей мененых которою колвек виною пенежною, крывавою, везеньем албо достоеньств врядов або именья одыймованьем винити и карати не маем и не будем, ажбы перво на сойме у суду явным рядом и поступком права, коли жалобник, то ест повод и отпор обжалованый очевисте станугь и достаточне наконец будуть поконаны. Которые по суде и по таковом поконанью винные мають быти карани виною, в артыкулех нижей описаных, меновите назначоною…

### *АРТЫКУЛ 4*

***О ображенье маестату нашого господарского, иж кождый обвиненый справоватися винен. И о том, хто перестережеть и где таковых судити. Также о словном мовенью або писанью о господару.***

Теж коли бы хто якого ж кольвек стану был найден явне подойзраный, иж маестат наш господарский образил, таковому жаден привилей, ани зацность, ани достоенство не маеть помагати, ани ся он им щитити можеть, абы ся не мел справовати, и где будеть правом поконан, абы не мел каран быти.

…Ведь же в том выступе коло ображенья маестату нашого господарского, где кому идеть о честь и о горло, таковых шляхту подданных наших нигде индей, одно на сойме великом вальном с паны радами нашими Великого князства Литовского мы, господар, судити и подле выступу кождого их тым караньем, яко вышей описано, карати роскажем…

### *АРТЫКУЛ 6*

***Хто бы кольвекъ с паньства нашого до земли неприятельское утекл.***

Теж уставуем, хто бы кольвек с подданых наших утекл с паньства нашого до земли неприятельское умыслом злым на здраду а ку шкоде нам, господару, и речы посполитой, такий честь тратить. А дети ачкольвек для того выступу отца своего почтивости своее не тратять, але от именей отца своего отпадывають…

### *АРТЫКУЛ 9*

***О спокойном и учстивом захованью при дворе нашом господарском.***

Уставуем, где бы хто, будучи при дворе нашом а не поважаючи пристойне зверхности нашего маестату, смел того ся важити, а на кого другого на палацу нашом торгнути словы быстрыми, ущипливыми, славе доброй и учстивости шляхетской шкодливыми, а о то бы ся укрывжоны до нас утекл з жалобою, тогды мы о тую реч ображоному справедливость неотволочную назавтрее ж, а надалей третего дня, маем с паны радами нашими, пры нас на тот час будучими, вделать…

## *АРТЫКУЛ 10*

### *О погамованью хоженья и стреляньня непотребного з ручниц и з луков при дворе нашом господарском и при кождом вряде нашом судовом.*

Еще теж видячи мы в многих людях зуфальства и своволеньства збытечные, а хотячи то срогостью права посполитого обваровати и завстегнути, уставуем, абы жаден якого кольвек стану будучи, не смел при дворе нашом господарском, где коли двором нашим мешкати будем, так на палац и двор наш, яко и по месту збройне и з жадными иншими бронями ходити, звлаща з ручницою, гаркабузом и з луком, и з жадною иною стрельбою, окром меча, корда, шабли, шпады и иншое ручное брони…

… А иж вряды наши судовые за порученьем нашим, шафуючи справедливостью людскою, местце нашо господарское заседають, прото беспечность их варуючи, хочем мети, абы таковый же покой з стороны неуживанья тое стрельбы помененое был захован завжды так при судех земских, гродских, подкоморских и комисарских. А против выступных с тое уставы при врядех наших такое каранье маеть быти стегано, яко тут в сем артыкуле нижей есть описано…

… А где бы и за позвом не стал, тот вжо тым самым учинком и непослушеньством ку праву не толко горло, але и честь тратити будеть за отосланьем врядовым з розсудку нашого господарского и панов рад того паньства на сойме за доводом стороны поводовое, водлуг права на конец учиненым, там же перед врядом нашим гродским на оном року запозваном…

## *АРТЫКУЛ 11*

### *Хто бы напротивку выроку нашому мовил.*

Теж уставуем, где быхмо мы, господар, с паны радами нашими з выроку нашого сказанье учинили, а хто бы смел против тому выроку нашому и по сказанью што противного мовити, тогды таковый якого ж кольвек стану, так высокого, яко и низшого, маеть седети на замку нашом шесть недель, а то никому не маеть быти отпущоно.

## *АРТЫКУЛ 12*

### *Хто бы з пригоды до земли сусед наших утекл, и о даванью таким глейту.*

Уставуем теж, естли бы хто з якое  пригоды припалое, окром ображенья маестату нашого и здрады речи посполитое, зъехал до земли якого суседа нашого, выймуючи землю неприятельскую, таковый почтивости, горла, ани именья не тратить, одно маеть справоватися тому, от кого будеть обвинен, и ласки нашое господарское перенайдовати за глейтом нашим. А тот глейт наш на врядех везде, где ся оборочати будеть, а особливе по местом, торгом и при костелех, маеть давати обволывати и прибиваньем цедул ознаймовати и рок выйстья глейту оповедати. А то для того, абы собе тым лепшую беспечность меть мог. А если бы в том часе не переправил собе ласки нашое господарское и тому, кому завинил, на справился, тогды мають

такового засе з границ паньства нашего за тым же глейтом нашим пропустити, леч не до земли неприятельское. А то мають чинити перед выйстьем глейту. А нам, господару, волно будеть глейт дальший дати еще раз, другий, а надалей и третий, яко бы ся от выволанья перед роком и шестьма неделями за тыми глейты выволаный з стороною своею противною росправил и ласку нашу господарскую собе перееднал. И хотя бы хто больш над то глейтов с канцлярыи нашое одержал, таковый глейт жадное моцы и важности, яко ку зволоце справедливости, одержаный, мети не будеть. То ж ся маеть розумети о даванью глейтов и тым, которые бы за нестаньем своим перед нами, господарем, або перед судом головным, будь теж до суду гродского и земского або за непоступленьем увязанья водлуг сего ж статуту, до выволанья прыходили.

### *АРТЫКУЛ 14*
### *О мандатех, в которых речах мають быть с канцлярии нашое даваны.*

Напервей мандаты мають быти даваны о ображенье маестату нашого господарского и о здраду речи посполитое. Теж хто бы у войску кого забивши або гвалт який, што несеть за собою вину крвавую учинивши утекл. Хто бы теж покой посполитый взрушил, яко есть вышей в артыкулех о ображенье маестату нашого господарского ширей описано. К тому где бы хто на панов рад наших, воевод, кашталянов, старост, подкоморих и на вряд судовый гродский и земский або комисарский, будучи им на справах наших господарских и земских або на суде седячих, а не поважаючи местца зверхности нашое господарское, торгнулся рукою и кого с тых станов помененых ранил або забил, тогды таковый маеть быть позыван перед нас, господара, мандатом нашим на сейм. А там на сойме з розсудку нашого, где ся то покажеть, честь и горло тратить. … Теж листы мандаты наши мають быти даваны в речах и пожитках, столу и скарбу нашого господарского належачих, то ест о доходы и пожитки з добр наших приходячие, и чиненья з них личбы и теж от кривды и шкоды подданых наших от врядников наших которые бы ся стали з укривженьем скарбу нашого от врядников наших. Еще теж мають быти мандаты даваны в тых речах, о которых в трибунале, то ест в артыкулех головных судов, до мандатов нашых дорога ест указана. К тому теж мають быть мандаты даваны о мыто, где бы старостове, державцы або мытники наши господарское мыто новое небывалое, яким кольвек назвиском названое, в местех, на селах, на дорогах, на мостех и торговое на торгох вымышляли и брали албо над уставу а привилья наши мыт подвышали и вытегали, албо от подвод наших господарских и шляхетских мыто по дорогах и в местечках брали. А за маньдатом кождый рок маеть быти завитый покладан от поданья очевистого або положенья на именью мандату, естли будем в здешнем панстве, - за чотыри недели, а естли за границою того паньства будем – за осм недель. А о иншие некоторые речы, кром тых вышей помененых и в трибунале описаных, артыкулы, маньдаты никому гволи с канцеляреи нашое не мають быть даваны. А естли бы были выданы, тогды

сторона о иншую реч, кром тых менованых, мандатом нашим позвана будучи, не повинна будеть перед нами становитисе. А за нестаньем жадная сказнь и отправа на такого давана быти и выданая моцы жадное мети не маеть. Для чого печатари и писары наши, постерегаючы в том достоенства и поваги маестату нашого и затрудненья справедливости людское, мають того пилновати, абы над сее замеренье мандаты с канцляреи нашое не выходили. А естли бы позваный перед нами стал о то, же его неслушне мандатом позвано, оказал, тогды тот, хто его вызвал, повинен будеть сам або прокуратор его, не сходечи с права, заплатити вины сто коп грошей, которое вины половица стороне, а другая половица до скарбу нашого быти маеть. А што се дотычеть бранья мыт через князей, панов, шляхту на именьях их, так подорожного, яко и торгового мыта, также и на перевозех, будь новых, незвыклых без данины нашое або подвышшаючи над уставу и привилья наши, таковых, хто бы то чинил, вольно будеть о то позвати до суду земского того ж повету, в котором се то деяти будеть, на рок завитый водлуг артыкулу двадцать девятого, в сем же розделе описаного. А о кроме тых причин так маньдатов, яко и позвы наши никоторие за двором нашим никому даваны быти не мають.

### *АРТЫКУЛ 16*

***Хто бы листы або печати наши и врядовые фальшовал, чим маеть быти каран.***

Коли бы хто листы або печати наши фальшовал або на кшталт руки нашое, так теж канцлера, подканцлерого и писаров наших дворных, земских, гродских и подкоморских того паньства Великого князства Литовского листы альбо привилья якие, змысливши, подписовал, або хто бы теж печати наши и врядов наших собе рыл и у себе их ховал и их уживал, таковый с права за оказаньем явностью певною и доводом слушным ничим иным, только на горле огнем каран быти маеть…

### *АРТЫКУЛ 18*

***Не маеть нихто ни за кого терпети, только кождый сам за себе.***

Теж уставуем, иж нихто ни за чий кольвек учинок не маеть каран и сказован быти, только тот, который в чом сам винен зостанеть, гды ж того право божое и справедливость хрестияньская учить. Яко ж так хочем мети, абы ни отец за сына, ани сын за отца, кром ображенья маестату нашого и речи посполитое здрады, яко вышей около того ест описано, ани жона за мужа, ани муж за жону, так теж брат за брата, отец и матка за дочку, дочка за матку або отца, сестра за сестру, и жадный прирожоный и слуга за пана, пан за слугу, и нихто иный ни за чый выступ и вчинок не был каран, только кождый сам за свой выступ маеть терпети и каран быти.

### *АРТЫКУЛ 20*

***О реч земленую межи именьями нашими князьскими, паньскими и шляхетскими, мы, господар, одным тым правом судитися маем.***

Теж мы, господар, обецуем и хочем, абы то через нас и потомков наших вечне было држано, иж где бы се трафило в именьях наших спор и розница межи грунтами нашими и теж межи грунтами костельными подаванье нашого, а также межи грунтами нашими и шляхетскими и межи тыми именьями, которые вышли з данины нашое дочасне, иж в той речи земленой маем мы и потомки наши, великие князи литовские, так же одным правом, яко и подданые наши Великого князства, судитися, а не иначей…

### *АРТЫКУЛ 21*
### *О листех заповедных, иж не мають быти с канцляреи нашое выдаваны.*

Теж обецуем, иж листов наших заповедных на продолженье справедливости людское, яко кольвек повстегаючи або задерживаючи ее от тых часов напотом до всяких судов, мы сами и потомки наши великие князи литовские давати не будем, кром только тых причин нижей описаных. Первое, коли бы хто о реч посполитую у неприятелей наших у везенью был; другое, коли бы хто на службе нашой и речи посполитой в посельстве до земль чужих або на граниченье паньств наших з паньствы або землями суседов наших заграничных, также и в наших речах господарских властных, за границу с паньств наших послан был, таковым только листы наши мають быти до стороны и вряду даваны…

### *АРТЫКУЛ 22*
### *О врядникох дворных, воеводах и старостах украинных и людях служебных, же се с права вымовляти не мають.*

Забегаючи мы, господар, продолженью справедливости людское, уставуем, иж врядники наши дворные, панове печатари, маршалки, подскарбие, писары, секрэтары и вси иные врядники и слуги наши дворные, также воеводове, старостове украинные и теж люди служебные, езные и пешие, в полю и на замкох будуючие, которие без рушенья посполитого за пенези служать, так ротмистры сами, яко и товаришы их будучи з именей своих до которого ж кольвек вряду або и перед маестат наш водле права позвани под часом покою в князстве Литовском не мають и не будуть мочы з отказу правного за бавою таковых служб своих вымовлятисе. И мы, господар, таковых листы нашими от права вымовляти не маем. Але кождый з них повинен будеть поступком правным або сам, або через умоцованого своего за позвы становитисе и усправедливяти, вынявшы тых, которые на службе речы посполитое або посельством в справах земских забавены будуть, што он по звороченью с тое послуги на перших рокох будучи позваный, явне оказати и усправедливитисе на другую послугу, не отъеждчаючи, маеть…

### *АРТЫКУЛ 27*
### *О листех железных, кому мають быть даваны.*

Теж уставуем, иж листы железные с канцляреи нашое не мають быти даваны тым, которые маетности свои на збыткох марне утратили и за токовыми збыточными утратами в долги попали. Але тым маем давати таковые листы, которые в долги пришли и в убоство попали з божьего допущенья, то ест ижбы огнем погорели або маетности их стонули, або бы от розбою, або от непрыятеля нашего забраны были, або хто бы теж для речи посполитое ку утрате и убоству и ку долгом пришол, также купцом и иным людем упалым, окром жидов…

### *АРТЫКУЛ 28*
### *Кому бы шло о честь, яко борздо справедливость учинена быти мает.*

Теж обецуем и будем повинни кождому с подданых наших, кому бы шло о честь, прудкую а неотволочную справедливость учинити на первшом близкопришлом сойме великом вальном с паны радами нашими Великого князства Литовского без всякое отволоки. А естли быхмо на первшом сойме для затрудненья справ речи посполитое того судити не могли, ино вжо на другом сойме конечно то скончити маем. А до розсудку нашого вшелякая примовка або обвиненье почтивости оного обвиненного ничого не маеть шкодити…

### *АРТЫКУЛ 29*
### *О мытах новых и о вольности засаженья местечок, и о будованью мостов або гробель в именьях шляхетских.*

Теж уставуем и приказуем, абы жадин чоловек в том паньстве нашом Великом князстве Литовском не смел новых мыт вымышляти ани на дорогах, ни на мостех, ани на греблях, ани на реках, ани на перевозех, ани в торгох, ани на местечках и стодолах  або корчмах, на гостинцах, в именьях своих, кромя которые бывали зстародавна уставлены, або мели бы на то листы продков наших або наши. …А которые здавна за привильями и листами нашими мыто и мостовое на именьях своих беруть, тые властным накладом своим в тых именьях своих на дорогах, гати, мосты, гребли, ровы направовати мають. …Так  теж врядники и мытники наши по дорогах, местечках и по селах наших господарскихъ и теж князских, паньских и земянских, где первей мыта не бирано, часу праздников и сходов жадный мыт и торгового вымышляти и брати не мають. …Так  теж и езы  на реках портовых, где зстародавна бывали, хто бы ставил, тогды предсе маеть местца зоставляти так слушные, абы езом  або тамованьем никому се шкода не стала. И таковых речей воеводове, старостове и державцы наши должны кождый в державе своей мають досмотрати. А новых мыт абы на реках портовых, на ставех и на греблях не было. Так теж на езох абы проходы слушные без завад на реках были заставованы. А хто бы з обывателей того паньства нашого якого кольвек стану и народу шляхетского для примноженья собе пожитку хотел на грунте своем местечко новое садити, то ему вольно будеть учинити, и торговое в нем водлуг давного звыклого

обычаю, яко се то в местечкох инших князских и паньских заховуеть, установити.

### *АРТЫКУЛ 30*

### *О небранью мыта от шляхты и подвод их.*

Теж з ласки и доброти нашое господарское князем, паном радом, духовным и светским, шляхте в том паньстве нашом даем тую вольность на водах, на дорогах, то ест сухим путем и воденым, на торгох и на мостех, так по именьях наших, яко и по их властных, спущати, провадити и продавати добровольне з их властных гумен кождому его роботы правдивое его збожъе, а не купленое, от того не маеть быти мыто давано…

### *АРТЫКУЛ 32*

### *Хто бы под ким што упросил, а тому наперод дано.*

Уставуем теж, хто бы под ким именье, люди, земли у нас, господара, упросил и в привилью бы то собе описал, а в того бы, под ким то он собе упросил, первей была на дате або на привилью нашом описано и то ему потвержоно, и того он поживал и в держанью был, тогды таковый первый привилей або лист при моцы маеть зостати. А за ним тот, кому дано тую реч держати и поживати, маеть водлуг листов и потверженья нашого первшого, а последние листы в ни во што обернены будуть. Также се мають розумети и о листех на вряды.

### *АРТЫКУЛ 34*

### *О недаванью двох достоеньств або врядов одной особе.*

За прозбою всих станов Великого князства Литовского бачечы мы, господар, з лепшим пожитком и оздобою речи посполитое, гды ж дыгнитарство и вряды два судовые одной особе даваны не будуть. Прото уставуем и мети то хочем и полнити обецуем, што ж одной особе бы назацнейшой и назаслуженшой двух дыгнитарств в лавицы рады нашое, так теж двух врядов, земских и дворных и староств судовых, от сего часу и на вси потомные часы давати не маем. А хто бы якое ж кольвек дыгнитарство в ряде нашой албо вряд дворный, земский, будь теж староство судовое против сего статуту одержал, такового владзы нихто подлечи не будеть повинен. И овшем хто кольвек его перед нас, господара, на сейм позоветь, тогды на первшом року яко на завитом стати маеть. И станеть ли албо не станеть, мы, господар, там же на том року оного дыгнитарства албо вряду судового, о который будеть позван, отсудити маем, а иншому дать. А тому, хто о то его позоветь, тот же позваный сто коп грошей заплатити повинен будеть, и то на маетности его отправлено быти маеть, не складаючи роков статутовых.

## РОЗДЕЛ ВТОРЫЙ: О ОБОРОНЕ ЗЕМСКОЙ.

## *АРТЫКУЛ 1*

### *О повинности, яко вси обыватели тутошнего паньства службу земскую служити мають.*

Уставуем теж с прызволеньем рад наших и всих станов подданых наших паньства того Великого князства Литовского, иж вси станы духовные и светские, княжата, панята и врядники земские, дворные, дворане и земяне, шляхта хоруговная и вдовы, и теж татарове и мещане мест наших, маючи именья, земские, и кождый от вышшого до низшого стану никого не выймуючи, лета зуполные маючие, часу потребы з нами и потомки нашими або при гетманех наших винни будуть сами особами своими войну служити и выправовати на службу военную, коли бы кольвек была потреба водле уфалы земское з соймов вальных, яко на он час будеть потреба указывати, звлаща, гды бы рушенье посполитое было уфалено, то ест яко з людей отчизных и похожих и з имeней яко отчизных, матерыстых, так выслужоных, и купленых, и яко кольвек набытых.

…А хто бы кольвек с тых подданых наших шляхты и рицерства всякого, также и всякого стану, маючи именья земские, войны не служил, або, приехавшы на рок положоный, не писалсе, а хотя бы и писалсе, а шиху не дождал, або, и шиховавшися без воли нашое або гетмана нашого великого проч поехал, тот именье свое все тратить на речь посполитую и на нас, господара, под тым обычаем, яко бы войны не служил. И для того ж мы, господар, обецуем тот вряд гетманьство великое годным и досветчоным людем народу шляхетского, родичом стародавным тутошнего паньства нашого Великого князства Литовского давати и тое местце засаживати.

## *АРТЫКУЛ 2*

### *О постановенью и обороне земской.*

Обецуем и уставуем вечными часы, иж гды будеть потреба против которого неприятеля нашого обороны земское сему паньству нашому Великому князству Литовскому альбо вальку вести, тогды мы сами, господар, и с паны радами нашими не маем и не будем мочы того учинити, ани серебщизны и плату никоторого и ниякого побору установляти так на подданых князских, паньских и земяньских, яко теж и на местех и подданых наших господарских, али ж первей съем великий валный зложившы. На который съем за росказаньем и листы нашыми будуть повинни вси станы, сойму належачые, зъехатисе и там, на сойме, мы, господар, и з их милостью паны радами и послы земскими, с порадою и згодным призволеньем их таковые речы о войне намовляти и становити маем. И який способ сполне за уфалою всих станов на сойме намовлен и постановлен будеть, таковым порадком отправоватисе маеть, а не иначей. А без сойму  и позволенья всих станов войны вщинати и вести не маем.

## *АРТЫКУЛ 3*

### *О невызволенье з войны листы нашими и теж кого вызволяти вольно.*

Теж уставуем, иж мы не маем жадного з войны от службы земское так словным росказаньем, яко и через листы нашы вызволяти и з войска отпущати. Так теж и гетманове наши не будуть мочы вызволяти и з войска отпущати, кром тых врядников и слуг нашых, которых мы, господар, на он час для послуг нашых и справ земских зоставим…

## РОЗДЕЛ ТРЕТИЙ. О ВОЛНОСТЯХ ШЛЯХЕТСКИХ И О РОЗМНОЖЕНЬЮ ВЕЛИКОГО КНЯЗСТВА ЛИТОВСКОГО.

### *АРТЫКУЛ 1*
### *О розмноженью Великого князства Литовского.*

Мы, господар, обецуем теж и шлюбуем то за себе и за потомки наши, великие князи литовские, под тою ж присегою нашою, которую есмо учинили всим обывателем всих земль Великого князьства Литовского, иж тое то славное паньство Великое князство и вси земли, ку нему здавна и тепер належачие, в славе, тытулех, столицы, зацности, владзы, можности, росказыванью и в инших всяких належностях и прислухиванью, и теж в границах, ни в чом уменшивати и уймовати або понижати не маем. И овшем ещо всего того примножати хочем и будем. И хотя бы пан бог з ласки своее светое нам, господару, узычити рачил паньства иного або и королевства, тогды предсе сего паньства нашого Великого князства Литовского, князей, панов рад, духовных и светских, и всих врядников земских и дворных, шляхту, рицерства и всих иных станов ни в чом не понижати, але от всякое легкости и пониженья стеречы и боронити будем с помочью божою, стараючисе о примноженье и вывышенье того паньства и всих достойностей, оздоб и пожитков з набольшою пилностью и усилованьем нашым.

### *АРТЫКУЛ 2*
### *О волностях шляхетских.*

Также мы, господар, обецуем словом нашим за нас и за потомки нашы, великие князи литовские, под тым же обовязком нашым, яко вышей у першом артыкуле ест описано, иж всих князей и панов рад, яко духовных, так и светских и всих врядников земских и дворных, панов хоруговных, шляхту, рицерства, мещан и всих людей посполитых у Великом князстве Литовском и во всих землях того паньства, маем заховати при свободах и волностях хрестияньских, в которых они, яко люди волные, волно обираючи зстародавна и з вечных своих продков собе панов а господарей великих князей литовских, жили и справовалисе прикладом и способом волных паньств хрестияньских, ровнуючи а однако маючи, и тых вольностей уживаючи, з суседы и братьею своею рицерством и иными станы народу коруны польское, а особливе над то при свободах и вольностях на привильях и листех великих князей литовских, продков наших. И от нас им так всим, яко и кождому зособна, на достоенствы, вряды, на именья, на люди, на грунты и на што ж кольвек даных, и што ещо будуть даваных вперод

непорушне и неотменне вечными часами ховати. И хто бы теж што хотя без привильев, за отчизным правом и яким кольвек обычаем набытым, именей людей и грунтов своих в держанью был за продков наших королей их милости полских и великих князей литовских Владислава, Ягейла и брата его Витольта, Жигимонта, великого князя Владислава Ягейлового сына Казимира Третего, Ягейлового сына Яна Ольбрихта, Александра, Жигимонта Першого и сына его Жигимонта Августа и Генрыка, за которого кольвек с тых激 панованья и теж за нашого щасливого панованья, тые сами с потомки и близкими своими и тепер то держати вечне мають и будуть. А о таковых добрах и грунтех шляхетских, абы вонтпливость жадная не была, волно завжды зо всими пожитками, которые бы се кольвек на их грунтех показовали, теж и крушцы всякие, и окна сольные зоставати мають. А мы и потомкове наши перекажать им не маем часы вечными вольного уживанья.

### *АРТЫКУЛ 3*

***О захованью в покою всих подданых наших, обывателей того панства з стороны розного розуменья и уживанья набоженьства хрестияньского.***

А иж теж привильем и поприсяженьем нашим ест утвержоно покою межы розными в релии стеречы.

… обецуем и обовезуемся под верою под почтивостью и сумненем нашим наперод жадного розорванья межы собою не чынить, ани розлученья жадного допустить… одной нероздельной Речы Посполитой ани одна часть без другое, пана собе обирати, ани спикненьем особливым з иншыми нарабляти, але подлуг местца и часу, тут назначоного, зъехатисе до громады корунное и спольне а спокойне тую справу обиранья пана водлуг воли божое до скутку слушного привести. А иначей на жадного пана не позволяти, одно с таковою певною а меновитою смовою, иж нам первей права вси, привилья и волности наши, которые суть и которые ему подадим, по обранью поприсегнути маеть.

А меновите то поприсегнути: покой посполитый межы розорваными и розными людьми в вере и набоженстве заховывать и нас за границу корунную нигды не тегнути жадным обычаем, ани прозбою королевскою своею, ани плаченьем пети гривен на древце, ани рушенья посполитого без уфалы соймовое чынити…

### *АРТЫКУЛ 4*

***Мы, господар, обецуем розмножати Великое князство Литовское и што бы розобрано и отышло, зась ку нему привернути.***

Теж добра паньства того Великого князства Литовского не уменшим и то, што будеть через неприятелей того паньства отдалено, розобрано и ку иншому паньству от того паньства нашего коли кольвек упрошоно, то засе ку власности того Великого князства привести, привлащити и границы направити обецуем. А хотя быхмо теж кому заграничником пры границах тых верхумененых земли, именья, села и люди дали, тогды таковые мають с

того служити Великому князству Литовскому. А хто бы не хотел служити - таковых привильев не маем мы и потомки нашы держати.

### *АРТЫКУЛ 5*

### *О неданье шляхты и их именей, людей, грунтов и всяких вольностей, и теж наданья листов и привильев против сему статуту.*

Уставуем и вечными часы то ховати и держати обецуем, иж яко продки наши великие князи литовские, так и мы не звыкли никому никоторым способом бояр, шляхты и их именей, грунтов и земль давати, так и тепер на вси потомные часы обецуем и прирекаем под тою ж присегою нашою, которую есмо учинили всим обывателем сего паньства нашего Великого князства Литовского, бояр, шляхты и их именей, грунтов и всякое маетности и иных свобод и волностей, и прав в них отбирати и отводити, и нияким особам которым кольве в том паньстве обывателем, яко и заграничником, и посторонным, и жадному иному, давати и записывати и никоторым способом отдаляти не маем. А где бы што одержано и вышло и яким же кольвек обычаем против сему статуту, то с права и з суду справедливого через нас и потомки нашы, за радою рад наших Великого князства, на сторону отложоно и в нивошто обернено быти маеть…

### *АРТЫКУЛ 6*

### *О сойме вальном, о соймиках поветовых и о выправованью их и посланью з них послов земских на вальный сейм и о вольных возных от войны, также о приеждчанью панов рад, врядников земских и шляхты.*

Уставуем для лепшого порядку во всих речах и способов ку справедливости и обороне, и жбы з волею всих на сойме потребы земские становили и отправованы были, абы вечными часы перед соймом великим вальным, который маем мы и потомки нашы завжды, коли того потреба укажеть речи посполитой, за порадою рад наших того ж паньства складаны листы нашими были, теж соймики поветовые, а меновите на тых местцах и воеводствах, нижей тут написаных и постановленых, которие соймики также листы нашими будуть складаны не на близший час и рок, только за шесть недель перед соймом великим. А листы нашы таковые соймовые мають быти приношоны з двору нашого до воеводств и староств судовых и отдаваны до рук врядов гродских за часу перед соймиками недель за две. А вряд маеть тые листы розсылати через возных поветовых до панов рад, до княжат, панят, врядников земских и поветовых и до инших станов народу шляхетского, до кого перед тым стародавна листы соймовые с канцеляреи нашое посылывано до домов их, мають носить. А для всих посполите в местех, местечках наших, на торгох и пры костелех парафеяльных обволывати и копеи з листов наших прибивати. Таковым же обычаем около розсыланья листов нашых военных вряд гродский заховатисе маеть. А возные поветовые винни будуть с пильностью тые листы розносити под караньем их за то через вряд гродский везеньем водле баченья своего. Гды ж возные, для таковых послуг земских, от службы военной вольни быти мають, на которые соймики мають

зъеждчатисе и бывати тые особы: бискупове, воеводове, кашталяни и врядники земские, князи, панове и шляхта, кождый у своем воеводстве або повете, а в земли Жомоитской бискуп, староста жомоитский, кашталян, тивунове и иные врядники земские и рицерство, шляхта. А намовляти о тых речах и потребах земских, которые им на тых листех нашых и через посла нашого ознаймены будуть, не мней теж и о всих потребах и долеглостях оного повету и воеводства. И большое зволившисе вси одностайным зданьем мають обрати послов своих, то ест от кождого суду земского, колько их в том воеводстве будеть, по две особе, и послати их на сейм, ознаймивши и поручивши все, о чом водле листов нашых господарских и теж в своих потребах радити, намовляти и становити будуть, даючы им моц на том таковом вальном сойме поступовати и кончити тые речы, которые им на соймику злецоны и на инструкцыи за печатьми обывателей того повету поданы будуть. А послове земские местца и вота свои мають мети водле порадку воеводств и поветов, яко которые по которих местца свои звыклые мають. А кождый з милости и повинности своее ку речы посполитой повинен на тые соймики прибыть. А хто бы не прибыл, под тое все подлегаеть, што се там становить. А соймик далей стояти и справа на нем ити не маеть, только надалей через чотыри дни. Але приеждчати вси на соймик винни будуть першого дня, а местца и порядок заседанья и вот на зъездех и соймикох тым обычаем маеть быти: воевода, кашталян. А где кашталяна нет, маршалок оного повету, подкоморый, хорунжий, судья, подсудок, войский, стольник, подстолий, писар земский, затым врядники и гродские панове и иншая шляхта.

### *АРТЫКУЛ 7*

### *О пенези стравные послом земским, выправуючы их на сейм вальный.*

За спольными намовами и згодным призволеньем всих станов обывателей того паньства нашого Великого князства Литовского уставуем, хотечи то мети на часы потомные, обранью послов з каждого воеводства и повету маеть быти им давано на страву так много, яко нижей писано.

| | |
|---|---|
| Виленьским послом | сто шестьдесят коп грошей. |
| Ошменьским послом | сто шестьдесят коп грошей. |
| Лидским послом | сто шестьдесят коп грошей. |
| Вилькомирским послом | сто шестьдесят коп грошей. |
| Браславским послом | сто двадцать коп грошей. |
| Троцким послом | сто шестьдесят коп грошей. |
| Городеньским послом | сто двадцать коп грошей. |
| Ковеньским послом | сто двадцать коп грошей. |
| Упитским послом | сто шестьдесят коп грошей. |
| Земля Жомойтская своим послом | двесте коп грошей. |
| Полоцким послом | сто шестьдесят коп грошей. |
| Новгородским послом | сто шестьдесят коп грошей. |

| | |
|---|---|
| Волковыйским послом | сто двадцать коп грошей. |
| Слонимским послом | сто двадцать коп грошей. |
| Витебским послом | сто шестьдесят коп грошей. |
| Оршаньским послом | сто шестьдесят коп грошей. |
| Берестейским послом | сто двадцать коп грошей. |
| Пиньским послом | сто двадцать коп грошей. |
| Мстиславским послом | сто шестьдесят коп грошей. |
| Меньским послом | сто шестьдесят коп грошей. |
| Мозырским послом | сто двадцать коп грошей. |
| Речицким послом | сто двадцать коп грошей. |

Ведь же если бы коли з допущенья божьего была дорогость збожъя и иное живности, тогды и болш маеть быти послом на страву давано водлуг уваженья часу и далекости дороги. Если бы се коли трафило с потребы речы посполитое, где далей над звыклое местце сейм мети, а откуль тым послом на страву маеть быти давано, то вжо особливою уфалою соймовою ест варовано, што замоцно держано быти маеть, одно не поддаючы под тое добр нашых господарских и костелных. Ведь же тые послове, обраные початку соймов, омешкивати не мають, так же и зъезду головного.

### *АРТЫКУЛ 8*

### *О соймику або зъезде головном в Слониме перед соймом великим вальным.*

… прото уставуем, иж перед кождым соймом великим вальным за две недели мають вси станы того паньства Великого князства, так панове рада их милость, яко и послове земские, зъезд свой вольный мети у Слониме. И там, знесши впосродок себе инструкцыи всих земль и поветов, мають межи себе намовы спольные в милости братерской о всих потребах земских чинити, приводечисе до одного слушного зрозуменья и уваженья речей ку доброму речи посполитое. За тым бы вжо на великом вальном сойме порадней и спешней справы и потребы речи посполитое становити и отправоватисе могли. А так у Слониме тот соймик трвати маеть водле часу и потребы, яко бы только на сейм великий в час прибыти не омешкали.

### *АРТЫКУЛ 9*

### *О складанью соймиков по сойме вальном и о даванью дармо с канцляреи справ соймовых.*

А гды се сейм валный доконаеть, тогды по выволанью сойму в чотырох неделях мають бывати в кождом повете соймики таким обычаем, иж послове, скоро прыехавшы з сойму, мають воеводе або старосте судовому о приеханью своем дати знати. А воевода або староста, або наместники их мають то через возных шляхте обволати, жебы на тот рок на соймик ку слуханью послов своих зъехалисе. А то для того, жебы на тых соймиках послове, с поветов на сейм посыланые, звернувшисе з сейму, дали о том всим обывателем кождого повету ведомость достаточную, што бы на котором сойме в справах и потребах речы посполитое справили и постановили и

которые се кольвек на такий соймик зъедуть, тые тых справ соймовых слухати мають. А неприбылые на такий соймик винам жадным не подлягуть, але соймовому постановленью досыть чинити мають. И то, што се на сойме постановить и уфалить, мають послове на писме за печатью нашою до повету своего принести и то ку захованью при книгах земских вряду земскому подати, также для ведомости тое речы, и до книг гродских дати то вписати. А с канцляреи нашое такие справы земские послом дармо выданы быти мають без жадного затрудненья.

### *АРТЫКУЛ 10*
### *Абы шляхтич безправне не был иман.*

Теж уставуем и вечными часы то мети хочем мы, господар, и потомки наши, иж все рыцерство шляхту Великого князства при вольностях их звыклых, которые от нас, господара, и от продков наших им суть наданы, будем повинни заховати и держати…

### *АРТЫКУЛ 12*
### *Около недаванья чужоземцом достоеньств и врядов всяких, а приходнем з иньших паньствах и оселости не давати.*

Также мы, господар, обецуем и шлюбуем под присегою нашою, которую учинили есмо Великому князству Литовскому и всим станом обывателем его, беручи то и з статуту старого короля его милости Жигимонта Першого, тому паньству Великому князству Литовскому даного, а в сесь укладаючы и на то позволяючы, што ж в том паньстве Великом князстве Литовском и во всих землях, ему прислухаючих, достойностей духовных и светских городов, дворов, грунтов, староств, держав, врядов земских и дворных посесый або в держанье и поживанье и вечностей жадных чужоземцом и заграничником, ани суседом того паньства давати не маем. Але то все мы и потомки нашы, великие князи литовские, давати повинни только Литве, Руси, Жомойти, родичом старожитным и уроженцом Великого князства Литовского и иных земль, тому Великому князству належачых. А хто бы з чужоземцов заграничников и суседов того паньства и всих земль, ему прислухаючых, важилсе што с того упросити, взяти и в держанье прийти, а упомененый будучы, того заразом не пустил, тогды маетность его вся маеть быти взята до столу и скарбу нашого Великого князства Литовского. Ведь же и тубыльцом, хотя и родичом Великого князства Литовского, достоеньства и вряды всякие мають быти даваны добре значным и правдиве незмышлене в том воеводстве або повете оселым. А хотя бы хто обчого народу за свои заслуги в той речы посполитой пришол ку оселости з ласки данины нашое або которым иным правом, тогды и таковый тольки оселости оное уживати маеть, учинивши первей присегу по взятью оное оселости на перших рочкох гродских оного повету перед врядниками земскими або гродскими того ж повету, которие на он час там прибыти могуть, иж маеть быти верным и зычливым тому паньству Великому князству Литовскому так, яко и тубылцы, и служечи службу земскую тому ж паньству. Але и таковые на достоенства и

всякие вряды духовные и светские не мають быти припущани, ани от нас господара, установлены, чого печатары и писары наши с повинности своее постерегати винни будуть.

### *АРТЫКУЛ 13*

***О захованью в целости достоеньств и всяких врядов того паньства.***

Теж обецуем и хочем вечными часы мети, абы панове рады наши, яко духовные, так и светские, и вси иные врядники наши земские и дворные в том паньстве нашом Великом князстве были во всяких достойностях и учтивостях захованы водле обычаю и кождый подле зацности местца своего. А што се дотычеть владности и справ их судовых, в том се они мають заховати и справовати, яко которому вряду здавно замероно и в сем статуте описано ест.

### *АРТЫКУЛ 14*

***О неотниманью достоенств и врадов на заочное обмовенье.***

Теж уставуем, иж достоенств всяких врядов, староств, держав, тивунств на справу чию ж кольвек, на обмовы заочные, мы и потомки нашы не маем отнимати…

### *АРТЫКУЛ 15*

***О держанью старых устав а новых без сойму вального не уставляти.***

Теж прирекаем вси привилья земские стародавные и ново от нас даные вольности и звычаи добрие стародавные ховати и ни в чом того не нарушати, а нового ничого не вставляти. А ведь же была ль бы потреба што нового прибавити ку доброму речы посполитое, тогды и того не маем чинити, ани устав жадных делати, алиж на вальном сойме з ведомостью и порадою рад наших и призволеньем всих станов, сойму належачых.

### *АРТЫКУЛ 16*

***О вольности выеханья с паньств наших до иншых паньств хрестияньских, кром тех земль неприятельских и о опеках таких именей.***

Теж узычаем и уфаляем вечными часы, абы княжата и панове хоруговные, шляхта и кождый чоловек рицерский и всякого стану того паньства Великого князства Литовского мели вольность и моц выехати и выйти с тых земль наших Великого князства для набытья наук, в писме цвиченья и учинков рыцерских, и теж, будучи неспособного здоровья своего для лекарств до всяких земль и сторон, кромя земль неприятелей наших, с ким бы тое паньство нашо на он час вальчило…

### *АРТЫКУЛ 21*

***О чужоземцу, наганеном о шляхетство и о набытью через него оселости.***

… А пакли бы который чужоземец, приехавши до здешнего паньства нашого, купил и яким кольвек слушным обычаем набыл собе именье шляхетское, а хотел волностей шляхетских уживати, тогды первей маеть указати перед врядом тым, где купил именье, если ест правдивый шляхтич. А где бы того не показал, тогды хотя именье купить, предсе з вольностей шляхетских веселитисе и их уживати не маеть и под хоруговъю заровно з шляхтою стояти не маеть…

### *АРТЫКУЛ 24*

***О шляхте, которые, именья свои попродавши, лифою се бавять.***

Уставуем: естли бы который шляхтич именье свое продавши, в месте мешкаючи, з лифы жил, уникаючи службы земское военное, таковые предсе з сумы своее пенежное винни службу земскую служити водле уфалы на он час соймовое, под утраченьем всего добра своего.

### *АРТЫКУЛ 26*

***О непривлащенье вольностей шляхетских людем простого стану.***

…Прото абы домы шляхетские не сходили, тогды товаруем, иж простого стану чоловек, не осегнувши первей от нас, господара, вольности шляхетское, именей и грунтов шляхетских никоторим обычаем поседати, ани куплею своею на вечность одержати не можеть…

### *АРТЫКУЛ 29*

***О вызволенье от платов новых, от подвод, будованья замков и мощенья мостов, так теж и о стацыю по дорогах.***

Иж теж привильями давными продков нашых королей их милости и великих князей литовских вси посполитые люди тяглые и мещане, подданые княжат, панов хоруговных, шляхты и бояр обывателей паньств наших земль Великого князства Литовского, от кождое дани податку, серебщизн и всяких поборов без добровольного самых панов их зезволенья и уфалы сойму валного и теж от дякла и ото всяких беремен повозовых, которые подводами зовуть, и от даванья стаций про нас и теж послов и гонцов наших, также от воженья каменя, дерева або дров ку паленью плиты и вапна на замки наши, от кошенья сена и от всякое сторожы и ловов, также от будованья и поправованья замков и мощенья мостов, и от иншых робот выняты суть.

…А што ся дотычеть оправованья замков и мостов старых и знову будованья, где до сего часу подданые шляхетские направовать и будовать были повинни, то маеть быти опатрывано з мыт новоподвышоных, што особливою констытуцыею соймовою варовано будеть…

### *АРТЫКУЛ 31*

***О непозыванье светских в духовное право о речи светские.***

Теж уставуем, иж бискупове, прелати стану духовного и их справцы княжат, панов и всей шляхты, рицерства и мещан и всих подданых нашых, яко и шляхетских, не мають никого ку собе до духовного права о светские

речи позывати. Так теж и сама шляхта, мещане и вси подданые нашы и теж подданые шляхетские якого кольвек стану не мають се до духовного права утекати и позывати о речы светские под закладом стороне позваной двадцатма копами грошей и под нагороженьем утрат всих з совитостью. Нижли што ку праву духовному належати и прислухати будеть, то в духовном праве справовано и сужоно быти маеть.

### *АРТЫКУЛ 35*

### *О мещанех места нашого Виленьского и о иншиx местах наших, яко шляхте справедливость з них чинена быти маеть.*

…вряд местский справедливость чинити маеть правом их майдеборским водлуг привильев их тому месту Виленьскому и мещаном нашим под местским правом мешкаючим, от продков наших и от нас, господара, наданых.

…А инших местех наших по всей земли того паньства нашого Великого князства Литовского вряды местские, хотя где и права Майдебурского уживають и привилья продков наших, або и наши на вольности таковые яко и место Виленьское, або инакшие собе бы наданье мели, предсе не майдебурским альбо собе наданым и упривильеваным правом, але сим статутом шляхте з мещан суд и справедливость вшелякую чинити повинни будуть. Гды ж только мещане наши места Виленьского, под местским правом мешкаючие, статутом первшим и теперешним до такого права суть припущоны.

### *АРТЫКУЛ 36*

### *О мерах и локтях, абы были ровные, и цена трунком и речам стравным была становена через вряд гродский.*

Уставуем, абы в месте нашом столечном Виленьском и в кождом месте нашом паньства нашого Великого князства Литовского так упривильеваных местах, яко и в меньших местечках, по тому ж местаех князских, паньских, духовных и светских и в домех гостинных, по дорогах, в торг и без торгов збоже всякое продавано мерою однакою ровновано…

### *АРТЫКУЛ 39*

### *Кнегинь, пань, княжен, панен, девок не маем ни за кого гвалтом давати.*

Теж обецуем и прирекаем, иж кнегинь, паней, вдов, княжен, панен, девок, шляхтянок и всякого иного стану рожаю женского, яко людей вольных под вольным пановаьем нашым господарским в том паньстве нашом Великом князстве Литовском мешкаючых, при вольностях их заховывати маем, а гвалтом ни за кого не маем давати без воли их. Але кождой из них с порадою приятелей их за кого хотя, за того у малженьство вольно будеть ходити и отдаватися…

### *АРТЫКУЛ 41*

***Всим станом народу шляхетского вольно именьями своими яко хотя шафовати.***

Теж уставуем, иж всим станом шляхетского народу, яко людем вольным, вольно ест и будеть именьями своими отчизными, материстыми, также и выслужоными на нас, господари, и яким же кольвек обычаем и способом набытыми, вечностью шафовати водле потребы, воли и уподабаня своего отдати, продати, даровати, заменити и на костел записати в долгу и в сумах завести и заставити, ведь же водлуг того, яко о том шырей в розделе семом о записех ест описано.

### *АРТЫКУЛ 45*

***Што бы кому через лист дано або упрошоно, а он бы того не вживал и в молчанью был через давность земскую десеть лет и хто бы теж у чужой земли был.***

Теж уставуем: если бы што кому дано або продано хотя бы записом слушным, будь теж и перед нами, господарем, або перед судом земским объявено, а оный бы, што ему дано, продано або записано, в держанью и поживанью через десеть лет не был и о то се врядовне не упоминал, таковый по выстью лет десети вжо того доходити не можеть, але држачий то вечне маеть мети…

### *АРТЫКУЛ 46*

***Мы, господар, шлюбуем однакую справедливость чинити всим, а пересуду мы и панове рады наши брати не мають, и о том же о почстивость мы сами, господар, судити маем.***

Обецуем теж з ласки, з доброти и милости нашое господарское ку подданым нашым всему рицерству Великого князства Литовского под сумненьем нашым, иж мы, господар, и панове рада наша маем кождого стану всим заровно справедливость чинити без отволоки. А от права не маем ничого пересуду брать, по тому ж и панове рады нашы пересудов брати не мають, ани маем теж стати и зычностью быти одной стороне, але просто кождому справедливость давати и чинити будем повинни. Так теж и панове рады наши и под присегою, которую до рады учинили, справедливость чинити будуть повинни. А што се дотычеть таких речей, о што почстивость отсужона бываеть, кроме тых артыкулов, суду замковому належачых, в том статуте нижей менованых, о то жаден с панов рад, ани суд замковый, ани теж суд земский поветовый не маеть судити, тольки мы сами, господар, с порадою панов рад наших на сойме вальном, обычаем, в сем статуте описаным, судити будем.

### *АРТЫКУЛ 51*

***О монополий, то ест недаванья одной особе в аренду и заведенье пожитков, всей Речи Посполитой належачых.***

…Особливе то варуем, иж податков, ани поборов жадных на именьях наших королевских и рад духовных, также цельновых, на местах наших в

Польще и в Литве, и во всих землях паньства нашого складать и постановлять не маем без зезволенья всих станов на сойме вальном…

## *РОЗДЕЛ ЧЕТВЕРТЫЙ : О СУДЬЯХ И О СУДЕХ*

### *АРТЫКУЛ 1*

***О вольном обиранью вряду земского, судий, подсудков и писаров в кождой земли и повете.***

…Еще ку розширенью большое вольности и осягненью прудшое справедливости рачил им за спольною на то всих станов згодою и призволеньем, яко верным подданым своим а людем здавна вольным, зацным и учтивым, того узычити и позволити, абы для шафунку и отправованья справедливости людское на местце господарское судьи земские, то ест судья, подсудок и писар, в кождой земли и повете водле розграниченья, розписанья и порадку около того вделаного, были вольне обираны…

### *АРТЫКУЛ 2*

***О судьях, яковые мають быти выбираны.***

Уставуем , иж на тые вряды, яко на судство, на подсудство и на писарство не мають быти выбираны духовные особы, ани кашталянове, маршалки и старостове судовые, ани подкоморые, войские, ани хоружие земские, дворные и поветовые и нихто таковый, который бы иншим врядником земским был, але таковые и так мають быти выбираны, яко вышей в першом артыкуле сего ж розделу описано…

### АРТЫКУЛ 12

***О печати нашой господарской, земской и теж о печатех врядовых, которыми што маеть быти печатовано.***

Теж мы, господар, даем под гербом того паньства нашого Великого князства Литовского Погонею печать до кождого повету, на который ест написани около гербу имя того повету. А тую печать писар земский присяжный у себе сам, а не хто иншый ховати маеть, которою печатью и под тытулом нашым позвы мають быти печатованы и выдаваны…

### *АРТЫКУЛ 57*

***Хто бы сам не мог або не вмел у права мовити и о приданью прокуратура людям убогим .***

…К тому, где бы хто, не могучы и не умеючы сам мовити и речы своее у суду справовати, а про убозство недостаток свой прокуратура сам собе способити не мог, яко вдовы и сироты, а просили бы вряду о прокуратора, тогды вряд маеть таковому прокуратора дармо прыдавати и казати от них у права мовити, и прокуратор маеть в том уряду быти послушон…

### *АРТЫКУЛ 59*

***О каранью фалшивых а потсупных прокураторов ,и к тому иж волно стороне прокуратора своего у права подпирати , и самому мовити , и другого прокуратора на его местце установити.***

…А хто бы теж у права сам стоячи хотел, отставити прокуратора своего, а сам свою реч мовити або другому прокуратору злетити, то ему волно будеть.

## РОЗДЕЛ ШОСТЫЙ : О ОПЕКАХ

### *АРТЫКУЛ 1*

***О лета детей недорослых.***

Уставуем, абы по смерти родичов детем, летне дорослым, шкоды и роспрошенья маетности их яко лежачых, так и рухомых не было, с тое причыны таковые дети, лет не дорослые, мають быти под справою и опатрностью опекунов, от родичов назначоных албо прирожоных, албо теж приданых до лет зуполных. А лета мущизна маеть мети зуполные осмнадцать лет, а девка тринадцать лет.

## РОЗДЗЕЛ СЕМЫЙ : О ЗАПИСЕХ И ПРОДАЖАХ

### *АРТЫКУЛ 1.*

***О записех именей отчизных, матерыстых и всяким обычаем набытых.***

Уставуем, иж волно кождому именья свои отчизные, матерыстые, выслужоные, купленые и яким колвек обычаем набытые и названые… водле воли и мысли своее отдати, продати, даровати, записати, заставити, от детей и близских отдалити, подле баченья своего тым шафовати…

## РОЗДЕЛ ОСМЫЙ: О ТЕСТАМЕНТЕХ.

### АРТЫКУЛ 8

***Нихто не может челедину домовому ани полоненику своему ничого записати , волным его не вчынившы.***

Уставуем, иж кождый якого колвек стану челедину домовому ани полоненику своему, не вчынившы его наперед волным, ничого тестаментом записати не может, ажбы его первей волным учынил.

## РОЗДЕЛ ДЕВЯТЫЙ:О ПОДКОМОРЫХ В ПОВЕТЕХ И О ПРАВАХ ЗЕМЛЕНЫХ; О ГРАНИЦАХ И О МЕЖАХ.

### *АРТЫКУЛ 32*

*О дорогах старовечных.*

Уставуем, иж дороги, великие гостинцы мають быти водле стародавного обычаю так широкие, абы на полтора прута быти могли. А воз порожний маеть уступовати возу наложоному, пеший- езному, езный– возу. А то если бы тесная дорога была, яко на мостех и в инших злых разех, а часу зимнего, гды снег бываеть великий, мають, поткавшися, дорогу по половицы делити, а один другого спихати не маеть.

## РОЗДЕЛ ДЕСЯТЫЙ: О ПУЩУ, О ЛОВЫ, О ДЕРЕВО БОРТНОЕ, О ОЗЕРА И СЕНОЖАТИ.

### АРТЫКУЛ 2

***Цена звером диким.***

Уставуем цену звером диким , которое бы через кого было убито у чужой пущы: за зубра—дванадцать рублей грошей, за лося—шесть рублей грошей, за оленя або за ланю—шесть рублей грошей, за медьведя—тры рубли грошей, за коня або за кобылу дикую—тры рубли грошей, за вепра або за свинью—рубль грошей, за сарну—копу грошей, за рыся—три рубли грошей, за соболя—два рубли грошей, за куну—полкопы грошей.

### *АРТЫКУЛ 18*

***О том , абы нихто на чужих грунтех полевати не смел.***

Гды ж мысливцы людям звыкли великие шкоды чинити, топчучи збожья, для того уставуем, абы, почавшы от свята семое суботы аж до зебранья с поль всякого збожья на чужых грунтех нихто полевати не смел…

## РОЗДЕЛ ОДИНАДЦАТЫЙ: О ГВАЛТЕХ, О БОЕХ, О ГОЛОВЩЫЗНАХ ШЛЯХЕТСКИХ.

### *АРТЫКУЛ 28*

***Хто бы шляхтича взял до везенья своего свовольне, и над ним се паставил албо его у везенью уморыл.***

… Кому ж кольвек от кого трафило, жебы явне змоцнившися альбо таемне сам через себе або через слуги подданные свои кого другого взял до везенья своего, чоловека невинного и правом непереконаного…

…оный таковое безправье терпячый, моцъю звирхности нашое господарское через посланца нашого, або через воеводу альбо старосту того повету, где ся то деяти будеть, за листом и посланцом его, маеть быти наперве з везенья вынят и выпущон…

### АРТЫКУЛ 68

***О непереховыванью выволаньцов во всих паньствах нашых.***

Абы люди своволные часу выволанья фолги и обцованья в паньствах нашых не мели, уставуем, же выволаньцы Великого князства Литовского,

также и чсти отсужоные во всих паньствах нашых, не толко у Великом князстве Литовском, але и во всих паньствах нашых не мають быти ни через кого переховываны.

## РОЗДЕЛ ДВАНАДЦАТЫЙ.
## О ГОЛОВЩИНАХ И О НАВЕЗКАХ ЛЮДЕЙ ПРОСТЫХ, И О ТАКИХ ЛЮДЕХ И ЧЕЛЯДИ, КОТОРАЯ ОТ ПАНОВ СВОИХ ОТХОДИТЬ, ТАКЖЕ И О СЛУГАХ ПРИКАЗНЫХ.

### *АРТЫКУЛ 1*

***О забитью чоловека простого стану от шляхтича.***

**…**если бы который шляхтич з зуфалства, з опилства и без данья причины своволне, умысльне, легце поважаючи право посполитое а паствечися над створеньем божим, чоловека простого стану, не шляхтича, забил, а был бы пойман заразом на горячом учинку в часе, вышей в сем статуте на горячий учинок замероном, таковый щляхтич за слушным доводом маеть быти горлом каран, кром головщизны…

### АРТЫКУЛ 20

***Хто бы в голод челядь свою выгнал.***

*Теж уставуем : естли бы хто в голод челядь свою неволную выбил з дому проч не хотечи их кормити и переховывати, и тая челядь сама себе у голод перекормила, таковые вжо не мають быти невольные, але вольными…*

### АРТЫКУЛ 24

***О лезных и о тых , которые , будучы без службы и неоселыми, до мест нашых господарских,князских и панских приходять.***

…таковых, которые без служфы живучи и ниякою роботою не бавятся, на костырстве и пьянстве час свой травять, нигде их жаден вряд терпети не маеть, але таковых кождого стану по упомненью першом и втором, а за третим дубцы бьючы, вон з мест и местечок выганяти казати повинен будеть…

## РОЗДЕЛ ЧЕТВЕРТЫЙНАДЦАТЬ:
## О ЗЛОДЕЙСТВЕ ВСЯКОГО СТАНУ.

### АРТЫКУЛ 3

***О поиманом з лицом в местех наших господарских и о зводех злодейства, с чим колвек хто поиман будеть.***

…А вед же суд подобенства всякие на доброй бачности мети маеть и в речах вонтпливых склоннейший маеть быти ку вызволенью, нижли ку караныю…

## АРТЫКУЛ 11

***О обвиненью в злодействе шляхтича, лет зуполных не маючого, также и о простых людях.***

Естли бы ся трафило, ижбы шляхтич в летех шестьнадцати, а не болш , обвинен о злодейство або приведен был з лицом, тогды таковому про молодость лет его не маеть быти поличоно за злодейство…

…тым же обычаем можеть розумети и о детях людей простых, лет не дорослых…

## АРТЫКУЛ 36

***О новом назвиску челеди дворное место того, што их перед тым неволниками звано.***

Ознаймуем и ведомо то чыним, иж што в сем теперешнем статуте тых людей о челядь, которые перед тым невольниками были званы, отменено назвиско и поменено, а написано их челедью дворною отчызною, материстою купленою, або полонениками…

## АРТЫКУЛ 37

***От которого часу тым статутом судити мають.***

А тые вси речы , в том статуте описаные, мають ся стегати на речы пришлые от того часу, яко закон фирмацыею нашою господарскою ку ужыванью сесь статут выдан…

## 9. КАМЕНТАРЫІ ДА СТАТУТА 1588 ГОДА

***Прывілей Жыгімонта ІІІ ад 11.02.1588 года падкацлеру Вялікага княства Літоускага Льву Сапегу на права друкаваць і выдаваць Статут*** дае права і даручае падканцлеру дзяржавы друкаваць і выдаваць законы і статуты. Неабходнасць друкавання законаў абгрунтоўваецца тым, што рукапісныя законы ствараюць шкодную разнастайнасць закона і цяжкасць у яго разуменні.

***Прывілей аб зацвярджэнні Статута ад 28.01.1588г.*** выдадзены ў сувязі з тым, што кандыдат на каралеўскі трон (прастол) у Рэчы Паспалітай швецкі каралевіч Жыгімонт Ваза, імкнучыся заручыцца падтрымкай феадалаў Вялікага княства Літоўскага (кандыдатамі на каралеўскі трон вылучаліся таксама аўстрыйскі эрцгерцаг Максіміліян і рускі цар Фёдар Іванавіч), на наступны дзень пасля каранацыі 28.01.1588 года падпісаў прывілей аб зацвярджэнні Статута, які ўводзіўся ў дзеянне з 6 студзеня 1589 года.

### *Прысвячэнне Статута і зварот да ўсіх станаў*

Леў Сапега, звяртаючыся не толькі да Жыгімонта ІІІ, але да шырокага кола насельніцтва Княства, папярэджвае на гістарычных прыкладах аб небяспечнасці тыраніі манарха ў дзяржаве. Спасылаючыся на аўтарытэт Арыстоцеля, ён амаль даслоўна цытуе яго словы: “Хто патрабуе, каб панаваў

закон, відавочна патрабуе, каб панавалі боскасць і розум, а хто патрабуе, каб панаваў чалавек, прыўносіць у гэта жывёльны пачатак… Закон – гэта свабодны ад бессвядомых позваў розум”. Спасылаючыся затым на Цыцэрона, Л.Сапега гаворыць, што закон з’яўляецца мундштуком або удзілам, які стрымлівае бяспраўе і злых, нястрыманых людзей і далей сцвярджае, што людзі з,яўляюцца нявольнікамі закона для таго, каб маглі свабодна карыстацца вольнасцямі ў дзяржаве. Нават сам гаспадар дзяржавы павінен дзейнічаць у межах закона. Тым самым Л.Сапега тэарэтычна абгрунтоўвае неабходнасць абмежавання ўлады манарха, захавання рэжыму законнасці і правапарадку ў дзяржаве з мэтай забеспячэння праваў чалавека і яго свабоднага развіцця . Ён ганарыцца тым, што сам Статут напісаны не якой-небудзь “обчай” (агульнай) мовай (мелася на ўвазе латынь), а сваёй уласнай мовай, мовай народа.

## *Раздзел 1.*

**Арт.1.** Замацоўваецца прававы прынцып адзінства права. Гаспадар аб,яўляе, што ўсе феадалы, шляхта, гараджане і ўвогуле ўсе падданыя дзяржавы, усе “от вышшого стану аж до нижшого”, таксама і чужаземцы з гэтага часу будуць судзіцца і справавацца пісаным правам – артыкуламі дадзенага Статута. Упершыню аналагічная норма з,явілася у Статуце 1529 года (р.1, арт.9).

**Арт.2.** Забарона завочнага абвінавачвання утрымлівалася ўжо ў граматах (1434, 1447 гадоў і інш.), затым была ўведзена ў папярэднія Статуты. Узбуджаныя справы павінны былі разглядацца толькі ў судовым парадку, у прысутнасці абвінавачанага і абвінаваўцы. Апошні ў выпадку ілжывага агавору належыў такому пакаранню, якое пагражала абвінавачанаму.

**Арт.4.** Тэрмін “ображенье маестату господарского”, які быў запазычаны з рымскага права, азначаў усялякія дзеянні, накіраваныя супраць манарха. Ад адказнасці за такія злачынствы не вызваляліся ніякія асобы, нават самыя радавітыя. Не вызвалялі ад адказнасці і дадзеныя раней прывілеі. Такія справы разглядаліся судом у адпаведнасці з законам. Тыя ж справы, якія тычыліся шляхецкага гонару, або за якія прадугледжавалася смяротнае пакаранне, разглядаліся соймавым судом.

**Арт.6.** Рэгламентуецца крымінальная адказнасць за такое дзяржаўнае злачынства, як уцёкі з тэрыторыі дзяржавы з мэтай здрады.

**Арт.10.** Закон ахоўвае парадак пры двары вялікага князя, што было абумоўлена і наяўнасцю у шляхты зброі (у тым ліку і агнястрэльнай).

**Арт.11.** Пад пагрозай крымінальнага пакарання забаранялася супярэчыць судовым пастановам вялікакняжацкага суда і суда паноў радных.

**Арт.12.** Рэгламентуюцца падставы і парадак выдачы пэўным асобам з вялікакняжацкай канцылярыі ахоўнай граматы (глейта, жалезнага ліста). Упершыню гэта норма была ўведзена Статутам 1566 года (р.1, арт.7).

**Арт.14.** Рэгламентуюцца падставы і парадак выдачы з вялікакняжацкай канцылярыі т.зв.мандату - спецыяльнага нарматыўнага

акту. Вызначаецца падсуднасць судоў пры разглядзе спраў па першай інстанцыі.

**Арт.16.** Развіваюцца палажэнні папярэдніх статутаў аб адказнасці за падробку і фальшаванне пячатак, а таксама розных дзяржаўных, службовых і судовых дакументаў.

**Арт.18.** Паўтараюцца палажэнні агульназемскіх грамат (1434, 1447 гг. і інш.) і папярэдніх Статутаў аб адказнасці кожнага чалавека за ўласную віну (прынцып індывідуалізацыі адказнасці ).

**Арт.20.** Вялікі князь абавязваецца ў выпадку ўзнікнення спрэчак адносна сваіх землеўладанняў і царкоўных, а таксама ўласных і шляхецкіх, судзіцца тым жа законам, што і ўсе падданыя дзяржавы, што сведчыла аб нарматыўнай рэалізацыі абвешчанага Статутам прынцыпа адзінства права.

**Арт.21.** Рэгламентуецца парадак выдачы з вялікакняжацкай канцэлярыі спецыяльных лістоў адносна прыпынення або адкладу разгляда судовай справы, даецца дакладны пералік падстаў выдачы.

**Арт.22.** Усе службовыя асобы дяржавы абавязваліся ў мірны час неадкладна з'яўляцца па вызаву ў суд. Закон не дазваляў адмаўляцца ад яўкі ў суд пад матывам выканання службовых абавязкаў. Таксама і вялікі князь не меў права іх вызваляць ад гэтага сваімі спецыяльнымі лістамі. Кожны са службоўцаў абавязваўся асабіста, або праз упаўнаважаных спецыяльнымі лістамі пэўных асоб , удзельнічаць у разглядзе судовай справы ў адпаведнасці з законам. Выключэнне складалі выпадкі, прадугледжаныя арт.21 гэтага раздзела, а таксама арт.23 чацвертага раздзела (цяжкая хвароба). Такім чынам рэалізоўваліся абвешчаныя Статутам прынцыпы справядлівасці і ўсеагульнасці права.

**Арт.27.** Рэгламентуецца парадак выдачы ахоўнага (жалезнага) ліста асобам, якія апынуліся ў складаным жыццёвым становішчы. Забаранялася выдаваць іх пэўным асобам. Паводле Статута 1566 года жалезныя лісты не выдаваліся супраць шляхты простым людзям, купцам, яўрэям.

**Арт.28.** Калі ў адпаведнасці са Статутам1566 года справы аб шляхецкім гонару разглядаліся вялікакняжацкім судом, то дадзены артыкул рэгламентуе неадкладны разгляд справы на бліжэйшым паседжанні сойма, а ў крайнім выпадку – на наступным. Да судовага разбіральніцтва асоба лічылася невінаватай. Гэты артыкул сведчыў (як і іншыя артыкулы Статута) аб заканадаўчай рэгламентацыі прынцыпа прэзумпцыі невінаватасці.

**Арт.29.** Дадзены артыкул развівае палажэнні папярэдніх статутаў, рэгламентуе мытныя пошліны і абавязкі мытнікаў, забараняе жыхарам дзяржавы самавольна ўтвараць новыя мытні і інш. Ён накіраваны на развіццё рамяства і гандлю ў дзяржаве.

**Арт.30.** Дазваляецца ўсім феадалам свабодна гандляваць збожжам, якое было вырашчана на іх уласных землях, без выплаты гандлевых пошлін. Дапаўняльна да аналагічнага артыкула папярэдняга Статута прыводзіцца тэкст прысягі адносна таго, што гэта збожжа (або тавар) менавіта з уласнага маёнтка, а не купленыя дзе-небудзь у іншым месцы.

**Арт.32.** Паўтараюцца палажэнні папярэдніх Статутаў адносна таго, што законнымі прызнаваліся тыя вялікакняжацкія граматы на маёнткі і пасады, якія былі выдадзены першымі ў часе. У выпадку, калі хто-небудзь атрымаў паўторную грамату, законнай прызнавалася першая.

**Арт.34.** У сувязі з тым, што феадалы часта займалі па некалькі пасад у дзяржаве, упершыню рабілася спроба абмежавання атрымання адной асобай некалькіх службовых пасад.

*Раздзел 2*

**Арт.1.** Вызначае катэгорыі насельніцтва, якія нясуць воінскі абавязак і адказнасць за ўхіленне ад яе выканання. Вялікі князь абяцае прызначаць на пасаду гетмана дзяржавы (галоўнай вайсковай асобы) толькі годных і дасведчаных шляхціцаў, якія з'яўляюцца ўраджэнцамі дзяржавы.

**Арт.2.** Заканадаўча замацоўваецца правіла вырашэння пытанняў адносна вайны і ваенных падаткаў толькі на агульнадзяржаўным сойме, прычым вайну можна было пачынаць толькі з дазволу ўсіх станаў.

**Арт.3.** Закон не дазваляе ні вялікаму князю ні гетману вызваляць ваеннаабавязаных асоб ад воінскай службы. Выключэнне складалі асобы, якія знаходзіліся на іншай дзяржаўнай службе.

***Раздзел 3***

**Арт.1.** Вялікі князь абяцае пад прысягаю ўсім жыхарам дзяржавы, нягледзячы на Люблінскую ўнію, захоўваць суверэнітэт Вялікага княства Літоўскага, правы саслоўя шляхты і ўсіх іншых станаў, клапаціцца аб прыбытках і узвышэнні дзяржавы.

**Арт.2.** Паўтараюцца палажэнні папярэдняга Статута. Гаспадар дзяржавы абяцае захоўваць усіх людзей у дзяржаве пры свабодах і вольнасцях. Палажэнне гэта толькі пракламіравалася і, магчыма, было ўведзена ў якасці даніны старажытнасці, калі ўсе свабодныя людзі маглі ўдзельнічаць у вечавых сходах, бо фактычна простыя людзі не мелі такіх правоў. У артыкуле даецца пералік вялікіх князей Вялікага Княства Літоўскага, акрамя Стэфана Баторыя, што сведчыць аб тым, што менавіта пры ім распрацоўваўся праект гэтага Статута.

**Арт.3.** У сувязі з існаваннем у дзяржаве розных рэлігійных канфесій, вялікі князь абавязваецца ахоўваць у грамадстве парадак і спакой паміж рознымі ў веравызнанні людзьмі.

**Арт.4.** Артыкул дапаўняе палажэнні першага артыкула дадзенага раздзела і абавязвае гаспадара , нягледзячы на Люблінскую унію, не толькі захоўваць тэрытарыяльную цэласнасць дзяржавы, але і дамагчыся звароту тых зямель, якія былі адарваны раней ад дзяржавы.

**Арт**.5.Паўтараюцца і ўдакладняюцца палажэнні **арт.4** трэцяга раздзела Статута 1566 года, у якіх вялікі князь пад прысягай абяцае ўсім жыхарам дзяржавы не адымаць у іх зямель, не пазбаўляць вольнасцей, дарчых грамат і іншых прывілеяў, падпарадкоўвацца статутавым нормам.

**Арт.6.** Удакладняюцца і дапаўняюцца палажэнні папярэдняга Статута 1566 года адносна парадка выбару дэпутатаў ад паветаў на сойм дзяржавы. Гаворыцца аб дзейнасці павятовых соймікаў, удакладняецца кампетэнцыя сойма як вышэйшага заканадаўчага органа дзяржавы.

**Арт.7.** Рэгламентуецца памер сумы грошай, якія выдаваліся павятовым дэпутатам на ўтрыманне пры ад'ездзе на сойм.

**Арт.8.** Гаворыцца аб скліканні перад пачаткам вальнага сойма галоўнага з'езда (сойміка) у Слоніме з мэтай выпрацоўкі агульнай ад усіх зямель і паветаў інструкцыі адносна тых пытанняў, якія будуць разглядацца на сойме.

**Арт.9.** Рэгламентуецца парадак склікання пасля паседжання вальнага сойма, павятовых соймікаў з мэтай справаздачы павятовых дэпутатаў. Пастановы сойма павінны былі запісвацца ў кнігі гродскіх судоў і захоўвацца ў земскіх судах.

**Арт.10.** Паўтараюцца і дапаўняюцца палажэнні папярэдніх законаў адносна таго, што ўся шляхта павінна ў дзяржаве захоўвацца пры іх свабодах і вольнасцях. Як правіла, забараняліся арышт і папярэдняе зняволенне аседлага шляхціца, за выключэннем затрымання яго на месцы здзяйснення такога злачынства, за якое пагражала смяротнае пакаранне.

**Арт.12.** Як і у папярэдніх заканадаўчых актах, забаранялася раздача чужаземцам пасад, званняў, зямель і іншай маёмасці.

**Арт.13.** Адзін з тых артыкулаў, які сведчыў аб захаванні суверэнітэта Вялікага княства Літоўскага насуперак Люблінскай уніі. Паны радныя і іншыя службовыя асобы дзяржавы захоўваліся пры ўсіх годнасцях і ў пашане.

**Арт.14.** Паўтараюцца палажэнні папярэдніх заканадаўчых актаў адносна абяцання гаспадара дзяржавы не пазбаўляць пасад і выслугаў па завочнаму абвінавачванню.

**Арт.15.** Паўтораны палажэнні арт.12 трэцяга раздзела Статута 1566 года, у якіх вялікі князь абавязваецца не парушаць і не адмяняць папярэдніх законаў, а новыя законы прымаць толькі на сойме з ведама і парады паноў радных і дазволу ўсіх станаў дзяржавы.

**Арт.16.** Як і Статут 1566 года, артыкул дазваляе асобам усялякага стану свабодна выязджаць за межы дзяржавы, за выключэннем тых дзяржаў, з якімі Вялікае княства знаходзілася ў стане вайны.

**Арт.21.**Чужаземец, які набыў нерухомасць у Вялікім княстве Літоўскім, карыстаўся правамі шляхціца, калі ў вызначаным законам парадку даказваў шляхецкую годнасць.

**Арт.24.** Новая норма, якая сведчыць аб зараджэнні новых, буржуазных праваднosін у дзяржаве. Шляхціц, які пачаў займацца ліхвярствам, усяроўна павінен быў на падставе пастановы сойма несці воінскую службу.

**Арт.26.** Як правіла, наданне шляхецкай годнасці простым лядзям дазвалялася ў выключных выпадках. Толькі ў 1775 годзе мяшчанам дазволілі набываць на праве ўласнасці шляхецкія маёнткі.

**Арт.29.** Упершыню гэта норма была замацавана на Гродзенскім сойме граматай 1434 года. Артыкул гаворыць, што ад дзяржаўных павіннасцей і падаткаў вызваляюцца ўсе прыватнауласніцкія цяглыя людзі і гараджане, за выключэннем добраахвотнай згоды іх уладальнікаў, або спецыяльнай пастановы сойма дзяржавы.

**Арт.31.** Заканадаўча замацоўваецца прынцып разгляду спраў свецкіх феадалаў у свецкіх судах, спраў духавенства – ў духоўных судах. Парушэнне гэтага правіла цягнула значныя матэрыяльныя страты.

**Арт.35.** Вызначаецца, якім правам судзіцца гарадское насельніцтва. У гарадах, якія мелі самакіраванне - гараджане судзіліся ўласнымі судамі па магдэбургскаму праву, у іншых гарадах, а таксама ў Вільні – павінны былі судзіцца ў адпаведнасці са Статутам.

**Арт.39.** Паўтараюцца і дапаўняюцца палажэнні арт.31 раздзела трэцяга Статута 1566 года аб тым, што жанчыны ў Вялікім княстве Літоўскім (дадавалася: усялякага стану) захоўваюцца пры іх вольнасцях і маюць права свабодна, за каго пажадаюць выходзіць замуж.

**Арт.41.** Упершыню на Берасцейскім сойме 1.06.1566 года была прынята пастанова аб свабодным распараджэнні усіх феадалаў сваімі маёнткамі. (Раней гэта рабілася толькі са згоды князя, а Статут 1529 года дазволіў ім распараджацца 1/3 часткай нерухомасці.) Гэты артыкул быў уключаны ў Статут 1566 года, што паклала пачатак развіццю інстытута буржуазнай уласнасці. Палажэнні яго паўтораны ў дадзеным артыкуле.

**Арт.45.** Для дысцыплінаванасці ўдзельнікаў грамадзянскіх праваадносін замацоўваюцца тэрміны іскавай даўнасці, што сведчыць аб актыўным развіцці ў дзяржаве эканамічных адносін.

**Арт.46.** Вялікі князь з панамі раднымі абавязваюцца судзіць усіх аднолькава справядліва і сваечасова разглядаць судовыя справы. Тыя справы, якія закраналі шляхецкі гонар, разглядаліся князем разам з панамі раднымі на сойме. Артыкул удакладняе і ў пэўнай ступні паўтарае палажэнні арт.28 першага раздзела, што сведчыць аб асаблівым клопаце ўлады аб ахове шляхецкай годнасці.

**Арт.51.** Удакладняецца кампетэнцыя сойма адносна дзяржаўных падаткаў. Новыя падаткі і пошліны з дзяржаўных маёнткаў уводзіліся толькі са згоды ўсіх станаў пастановамі сойма.

### *Раздзел 4*

Раздзел, які налічвае 105 артыкулаў, прысвечаны ў асноўным судоваму ладу і судаводству. У ім гаворыцца аб дзейнасці выбарных, аддзеленых ад выканаўчай улады земскіх судоў (**арт.1**), аб забароне сумяшчэння судовых пасад з адміністрацыйнымі і духоўнымі пасадамі (**арт.2**), аб зацвярджэнні вялікім князем кожнаму павету гербавай пячаткі (**арт.12**) і інш.

**Арт.57-59.** Рэгламентуюцца працэсуальныя гарантыі абароны правоў асобы, у тым ліку права кожнага чалавека на абарону сваіх правоў у судзе з дапамогай адваката. Паўтараюцца і ўдакладняюцца палажэнні папярэдняга Статута 1566 года ў тым ліку і адносна таго, што калі хто-небудзь па сваёй

беднасці не мог наняць адваката, асабліва гэта тычылася ўдоў і сіратаў, то адвакат яму павінен быў прызначацца бясплатна. Закон дазваляў адмовіцца ад паслуг пэўнага адваката, або замяніць яго ў судовым працэсе.

### *Раздзел 6*

**Арт.1.** Рэгламентуецца ўзрост дзеяздольнасці асобы ў Вялікім княстве Літоўскім: для мужчын з 18, для жанчын з 13 гадоў (па папярэднім Статутам – з 15 гадоў). З гэтага ўзросту яны вызваляліся з-пад апекі, маглі здзяйсняць здзелкі, распараджацца маёмасцю і інш.

### *Раздзел 7*

**Арт.1.** Паўтараецца большасць палажэнняў папярэдняга Статута. Акрамя таго, гаворыцца аб праве кожнага чалавека на валоданне сваёй маёмасцю і распараджэнне ёю.

### *Раздзел 8*

**Арт.1.** Закон забараняе завяшчаць маёмасць на карысць нявольнага чалавека да таго часу, пакуль не будзе афармлена вольная. Артыкул, які ўпершаню быў запісаны ў Статуце 1566 года, сведчыць аб пашырэнні правоў гэтай катэгорыі насельніцтва.

### *Раздзел 9*

**Арт.32.** Аб абавязках гараджан і сельскіх жыхароў трымаць дарогі ў належным стане, своечасова іх рамантаваць было запісана яшчэ ў прывілеях. Вызначэнне габарытаў дарог і правілаў дарожнага руху, зробленыя ўпершыню Статутам 1566 года, сведчаць аб імкненні заканадаўцы ахапіць заканадаўчай рэгламентацыяй як мага больш грамадскіх адносін.

### *Раздзел 10*

Нормы раздзела прысвечаны не толькі абароне феадальнай зямельнай уласнасці, але і рэгламентацыі лясных промыслаў, ахове прыродных багаццяў і навакольнага асяроддзя. Замацоўваецца парадак карыстання зямельнымі і ляснымі ўгоддзямі (пушчамі, рэкамі, азерамі і інш.), рэгламентуюцца пытанні, звязаныя з паляваннем, рыбнай лоўляй, бортніцтвам і г.д. Пад аховай закона знаходзіцца флора і фауна. Аб гэтым сведчыць вызначэнне штрафа за разбурэнне птушыных гнёздаў, даволі поўная рэгламентацыя штрафаў за дзікіх звяроў (**арт.2**), заканадаўчае замацаванне тэрмінаў палявання (**арт.18**) і шмат іншае.

### *Раздзел 11*

**Арт.28.** Палажэнні артыкула накіраваны на абарону правоў чалавека. Пад пагрозай пакарання забараняецца ўтрымліваць самавольна ва ўласнай турме чалавека, які ня быў прызнаны вінаватым у судовым парадку.

**Арт.68.** Заканадаўца клапоціцца аб захаванні правапарадку ў дзяржаве і таму забараняе хаваць у сваім доме тых людзей, якія былі аб’яўлены судом па-за законам.

*Раздзел 12*

**Арт.1.** Статут аб'яўляе, што кожны чалавек павінен паважаць чалавечыя і боскія законы і калі іх пераступае нават асоба, належачая да самага прывілеяванага саслоў'я дзяржавы, яна павінна адказваць у адпаведнасці з законам

. Крымінальная адказнасць за забойства шляхціцам простага чалавека вызначалася і папярэднімі законамі, аднак упершыню ў якасці меры пакарання прадугледжваўся не проста грашовы штраф (галоўшчына), але смяротнае пакаранне, што сведчыць аб імкненні заканадаўцы аднолькава абараняць жыццё кожнага чалавека незалежна ад яго класавай і саслоўнай прыналежнасці.

**Арт.20.** Артыкул сведчыць аб адмоўных адносінах заканадаўцы да стану няволі чалавека.

**Арт.24.** З 1496 года да сярэдзіны XVI ст. соймы Вялікага княства прынялі больш дзесятка пастаноў, якія прадпісвалі пераследаваць лёзных людзей (людзей без пэўных заняткаў), што знайшло адлюстраванне і ў гэтым артыкуле.

*Раздзел 14*

**Арт.3.** Палажэнні артыкула замацоўваюць фактычна адзін з важнейшых прававых прынцыпаў – прэзумпцыю невінаватасці. Закон прама абавязвае суд у няпэўных выпадках, пры ўзнікненні сумненняў суддзяў адносна вінаватасці падсуднага, схіляцца да вызвалення яго ад адказнасці. Гэта правіла пашыралася і на простых людзей.

**Арт.11.** Артыкул сведчыць аб тэндэнцыі гуманізацыі права ў Вялікім княстве Літоўскім. Узрост крымінальнай адказнасці асобы павялічваецца з 14 гадоў (па Статуту 1566 года) да 16 гадоў.

**Арт.36.** Адмоўнае стаўленне заканадаўцы да стану няволі чалавека пацвярджаецца абмежаваннем крыніц нявольніцтва і ўвядзеннем замест назвы "чэлядзь нявольная" новай назвы – "чэлядзь дваровая".

**Арт.37.** Артыкул рэгламентуе парадак увядзення ў дзеянне Статута 1588 года.

# ЗАКЛЮЧЭННЕ

Развіццё канстытуцыйнага права феадальнай Беларусі XV-XVI стагоддзяў, якое праходзіла пад уздзеяннем шэрагу ўнутраных і знешніх сацыяльна-эканамічных і палітычных прычын, адбывалася на падставе звычаёвага права і ўвасабляла ўвесь папярэдні прававы вопыт дзяржаў-княстваў старажытнай Беларусі. Прававая сістэмы Вялікага княства Літоўскага, застаючыся ў сваёй аснове нацыянальна-самабытнай, будавалася на актыўным выкарыстанні найноўшых дасягненняў еўрапейскай прававой культуры.

Помнікі права з'яўляюцца найбольш дакладнымі і надзейнымі крыніцамі ведаў аб палітыка-эканамічным становішчы той ці іншай дзяржавы, структуры грамадства, правах і абавязках усіх пластоў насельніцтва і інш. У іх знаходзяць адлюстраванне філасофскія, палітыка - прававыя погляды грамадства, культура і быт народа. У помніках права беларускага народа, напісаных на старажытнай беларускай мове мы бачым ход гістарычнага развіцця права ад простых формаў прававых актаў да больш складаных і маем магчымасць ацаніць узровень развіцця нацыянальнага права і параўнаць яго с правам іншых краін і народаў.

Помнікі права сведчаць аб арганічнай уключанасці і залежнасці права ВКЛ ад сацыяльна-палітычных працэсаў, характэрных для ўсёй супольнасці еўрапейскіх народаў. У XV-XVI стагоддзях актывізуецца працэс складвання нацыянальных дзяржаўнасцяў і фарміравання нацыянальных культур. Духоўна-культурнае развіццё Беларусі гэтага перыяду адзначана глыбокім успрыманнем гуманістычнай ідэалогіі. Філасофска-прававыя ідэі Ф. Скарыны і іншых вучоных аб маральна-гуманістычным прызначэнні права, аб неабходнасці нарматыўна-прававога ўладкавання грамадскага жыцця спрыялі развіццю правасвядомасці народа, што ў сваю чаргу стварала ідэйна-тэарэтычную падставу прававой рэформы XVI ст. З'яўленне Статутаў 1529, 1566, 1588 гадоў стала вынікам і сведчаннем высокага ўзроўню прававой культуры беларускага народа і прыкладам кадыфікацыі заканадаўства для іншых дзяржаў.

Працэс кансалідацыі старажытных беларускіх земляў-княстваў у адну агульную дзяржаву і складаныя ўзаемаадносіны з суседнімі дзяржавамі садзейнічалі развіццю канствытуцыйнага права. Ужо ў XV стагоддзі агульназемскія граматы, якія з'ўляліся феадальнымі хартыямі, замацавалі важнейшыя канстытуцыйныя нормы і прынцыпы, у тым ліку суверэнітэт дзяржавы. Статуты XVI стагоддзя абагульнялі і развівалі далей канстытуцыйныя палажэнні папярэдніх заканадаўчых актаў. Статут 1588 года, які дзейнічаў на працягу XVI- пачатку XIX стагоддзяў, з'яўляўся па сваёй сутнасці сапраўднай Канстытуцыяй дзяржавы.

**ЗМЕСТ**


УВОДЗІНЫ **3**

1. СТАТУТ 1529 ГОДА- ПЕРШЫ ЗВОД ЗАКОНАЎ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА **5**

2. РАЗВІЦЦЁ КАНСТЫТУЦЫЙНЫХ НОРМАЎ У СТАТУЦЕ 1566 ГОДА **8**

3. СТАТУТ 1588 ГОДА - АСНОЎНАЯ КРЫНІЦА КАНСТЫТУЦЫЙНАГА ПРАВА БЕЛАРУСІ XVI-XVIII СТАГОДДЗЯЎ **11**

4. СТАТУТ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА 1529 ГОДА (вытрымкі з выдання: Статут Вялікага княства Літоўскага 1529 года. Мн., 1960.) **15**

5. КАМЕНТАРЫІ ДА СТАТУТА 1529 ГОДА **21**

6. СТАТУТ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА 1566 ГОДА (вытрымкі з выдання: Статут Великого князьства Литовского 1566 года и поправы статутовые 1578 года // Временник Московского о-ва истории и древностей российских. 1855., кн.25.) **25**

7. КАМЕНТАРЫІ ДА СТАТУТА 1566 ГОДА **38**

8. СТАТУТ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА 1588 ГОДА **42** (вытрымкі з выдання: Статут Вялікагя княства Літоўскага 1588: Тэксты.Давед.Камент.-Мн.: БелСЭ, 1989.)

9. КАМЕНТАРЫІ ДА СТАТУТА 1588 ГОДА **67**

ЗАКЛЮЧЭННЕ **75**